

СТРАТЭГІЯ ВЯСКОЎЦАЎ МС

СВАТАЎСТВО АРЫСТАКРАТА 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЧЭРВЕНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 108 (28724)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Зараз ажыццяўляецца падрыхтоўка нарматыўнай базы і арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў для правядзення цеплавой мадэрнізацыі эксплуатуемага жылога фонду. Рыхтуем праект указа, які прадугледжвае стварэнне ўмоў для таго, каб уласнік кватэры быў зацікаўлены ўкладаць нават асабістыя сродкі ў цеплавую мадэрнізацыю. Акрамя таго, мяркуецца задзейнічаць фонды інавацыйнага развіцця рэгіёнаў, сродкі мясцовых бюджэтаў, прадугледжаныя на капітальны рамонт. Думаю, што не пазней ліпеня кіраўнік дзяржавы разгледзіць і падпіша гэты ўказ».*

# Ластаўчын бераг



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Настаўнік Стахаўскай школы Столінскага раёна Аляксей СЕМЯНЯКА часта наведвае прыпяцкую пойму, якую называюць Палонь, — у летне-вясенні час ва ўрочышчы выводзіцца вялікая колькасць дзікіх птушак. На гэтым здымку Аляксей назірае за паводзінамі ластавак-берагавушак.**

## КОРАТКА

- Беларусь прыцягне грант фонду E5P у 2 млн еўра на будаўніцтва палігона цвёрдых адходаў для Пухавіцкага і Чэрвеньскага раёнаў.
- **Возера Нарач увайшло ў топ-3 курортаў СНД, папулярных сярод расійскіх турыстаў гэтым летам, паводле рэйтынгу агенцтва «ТурСтат».**



- Лабараторыя сну для комплексага лячэння пацыентаў з ЛОР-паталогіяй адкрылася ў РНПЦ отарыналарынгалогіі. У лабараторыі будзе праводзіцца як дыягностыка, так і падбор сучаснай кансерватыўнай тэрапіі з адначасовым кантролем яе эфектыўнасці.
- **Балет «Тытанік» пастаявіць у Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры, прэм'ера адбудзецца 12, 13 і 22 ліпеня.**

■ Маладзечна-2018

# Традыцыі нязменныя!..

### Найлепшыя беларускія паэты і песні — на нацыянальным фестывалі



**Ужо сёння ў Маладзечне распачынаецца XVIII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2018». За час існавання фэсту пройдзена шмат, за ім замацаваны статус сапраўднага беларускага брэнда. Каб пабачыць дзействы на розных фестывальных пляцоўках, збіраюцца не толькі самі маладзечанцы, жыхары нашай краіны, але і госці з замежжа. Бо наша нацыянальнае не можа не радаваць — яно адметнае і прывабнае!.. Пра сакрэты фестывальнага жыцця карэспандэнт «Звязды» распытала дырэктара Палаца культуры горада Маладзечна, асноўнага арганізатара фестывалю Святлану САРОКУ. Мы паразмаўлялі пра традыцыі і навінкі, пра розныя пляцоўкі, на якіх у свой час праходзіў фестываль, а таксама пра тое, ці будзе сёлета падчас фестывалю традыцыйны дождж?..**

СТАР. 7

■ Прыёмная кампанія — 2018

# «АДКРЫТА, ПРАЗРЫСТА І ДОБРАЗЫЧЛІВА...»

### Умовы для самарэалізацыі будуць створаны кожнаму абітурыенту

**Больш як 160 работнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю будуць задзейнічаны ва ўсіх этапах прыёмнай кампаніі: ад правядзення ЦТ, унутрыўніверсітэцкіх іспытаў да падачы дакументаў і залічэння. Напярэдадні старту цэнтралізаванага тэсціравання ў сценах КДК адбылося пасяджэнне Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Яе асноўнай задачай з'яўляецца стварэнне для ўсіх абітурыентаў роўных магчымасцяў пры паступленні ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.**

— У нашай краіне створана і эфектыўна рэалізуецца цэласная сістэма арганізацыі ўступнай кампаніі і кантролю за правядзеннем уступных іспытаў, — падкрэсліў **старшыня КДК Леанід АНФІМАЎ.** — Разам з выкананнем задач па прадухіленні парушэнняў падчас уступных выпрабаванняў членамі дзяржкамісіі будуць аб'ектыўна і аператыўна разгледжаны ўсе звароты абітурыентаў і іх бацькоў.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# ПРЫРОДА БУДЗЕ ПАД НОВАЙ АХОВАЙ

**Юрый Церцель назначаны начальнікам Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Беларусі. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць навесці парадак у ведамстве.**

«Вельмі шмат будзе крыватолкаў, размоў, што Лукашэнка зноў узяў крэн на назначэнне ваенных у тыя ці іншыя грамадзянскія структуры. Я гэтага абсалютна не баюся, вы павінны быць да гэтага гатовы. Больш за тое, дзяржаўная інспекцыя — не скажаш, што яна грамадзянская. А з тым бачаннем, якое ў мяне на гэту інспекцыю, яна больш, чым ваенная», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«У нас багацце адно — гэта прырода», — заўважыў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што гэты дар не можа быць бясконца добрым, калі да яго дрэнна ставіцца. «Яго трэба берагчы, аднаўляць. Нашу прыроду трэба захаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы і растлумачыў, што з гэтай прычыны і была створана інспекцыя. «Я думаў, што мы навядзём у гэтым парадак жорсткі. І мы гэта зрабілі. Але з цягам часу сёй-той «забранзавеў», сёй-той забыў свае функцыянальныя абавязкі. І ў барацьбе з правапарушальнікамі і браканьерамі рознага тыпу некаторыя самі сталі браканьерамі. Гэта дайшло і да начальнікаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. З такім кіраўніцтвам сістэма не можа эфектыўна працаваць, таму, як звярнуў увагу Прэзідэнт, неабходна было адхіліць ад займаемых пасад шэраг начальнікаў гэтай інспекцыі. «Даручыў знайсці чалавека строгага, дысцыплінаванага — ваеннага чалавека. Іх было дзясяткі, выбар прыпаў на вас», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу: «Прыйсці ў інспекцыю, разабрацца з тым штатам, з якім вы будзеце працаваць, паглядзець на людзей і жалезнай рукой навесці парадак у інспекцыі, а затым і ліквідаваць вузкія месцы, якія, магчыма, узніклі ў ахове жывёльнага і раслiннага свету».

Юрый Станіслававіч Церцель нарадзіўся ў 1967 годзе ў вёсцы Прывалкі Гродзенскага раёна. Пасля тэрміновай службы ва Узброеных Сілах СССР ён стаў курсантам Бранскай спецыяльнай сярэдняй школы міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў СССР і да 2002 года праходзіў службу ў органах унутраных спраў. У 1996 годзе завочна скончыў Акадэмію МУС Беларусі. У 2002— 2009 гадах праходзіў службу на розных пасадах у вайсковай часці 1250 органаў пагранічнай службы. Са студзеня 2009 года да 2018 года — камандзір вайсковай часці 1250. Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, медалямі «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы», «За бездакорную службу» III, II ступені.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# РАЗВІЦЦЁ — ІНФРАСТРУКТУРЫ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка разам з віцэ-прэзідэнтам Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця Аланам Пію абмеркавалі праекты, якія рэалізуюцца ў нашай краіне. Прэзідэнт Беларусі адзначыў узровень супрацоўніцтва, які існуе ў апошнія гады, і сказаў, што бачыць вялікі пазітыў. «Я вам удзячны за тыя, асабліва інфраструктурныя, праекты, якія мы рэалізуем разам з вамі», — звярнуў увагу беларускі лідар.**

«2 млрд еўра — гэта добры аб'ём, які вы інвеставалі ў Беларусь. За мінулы год — амаль $200 млн, — прывёў лічбы Аляксандр Лукашэнка. — І я так разумею, што мы для Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця з'яўляемся прымальным партнёрам».

Прэзідэнт адзначыў, што банк цікавіцца дзяржаўным сектарам і супрацоўнічае з ім. «Ваш банк з'яўляецца актыўным прыхільнікам прыватызацыйных працэсаў, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Вы ведаеце нашы падыходы да прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці, дзяржаўных аб'ектаў. І я не думаю, што мае погляды на прыватызацыю носяць нейкі асаблівы характар і залішне адрозніваюцца ад тых падыходаў, якія прапаведуе Еўрапейскі банк (рэканструкцыі і развіцця. — **Аўт.**). Справа ў тым, што мы абсалютна не супраць працэсаў прыватызацыі. Гэта цалкам натуральная норма». Як растлумачыў Прэзідэнт, наша пазіцыя зыходзіць з таго, што, калі дзяржава не можа кіраваць нейкімі актывамі, трэба іх аддаць эфектыўнаму ўласніку. «Мы супраць абвальнай і шокавай прыватызацыі. Гэта сутнасць нашага падыходу, таму што, пагадзіцеся, аб'екты дзяржуласнасці стваралі ўвесь народ, асабліва ў былыя часы. У нас неблагія аб'екты. І ўзяць росчыркам пяра агулам іх прадаць за бясцэнак — гэта азначае спарадзіць несправядлівасць». Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што прыватызацыя не павінна быць нейкай сферай напружання ў грамадстве. Ад гэтага працэсу неабходна атрымліваць перспектывы нармальнага заробку, працоўныя месцы, даходы ў бюджэт і развіццё.

Пасля сустрэчы Алан Пію расказаў журналістам пра асноўныя праекты, якія зараз рэалізуюцца сумесна з ЕБРР. Так, ён адзначыў, што ўжо некаторы час ідзе супрацоўніцтва з Нацыянальным банкам і ўрадам для таго, каб палепшыць аперацыі Белінвестбанка. Зараз ЕБРР разглядае канкрэтнае рашэнне па ўваходжанні ў акцыянерны капітал Белінвестбанка. Алан Пію спадзяецца, што гэта адбудзецца да канца бягучага года. Але пасля ўваходжання ў капітал работа не скончыцца. «Разам з урадам, Нацыянальным банкам мы будзем усяляк імкнуцца да таго, каб Белінвестбанк рос, каб павялічваўся яго пакет аперацый, каб ён падняўся да таго ўзроўню, калі ён будзе цікавым стратэгічнаму інвестару, прыцягненне якога мы будзем абмяркоўваць разам з беларускім урадам», — адзначыў віцэ-прэзідэнт.

Што датычыцца індыкатараў працы беларускай эканомікі, то, па словах Алана Пію, яны паказваюць пазітыўнае паляпшэнне па шэрагу кірункаў. У першую чаргу гэта датычыцца эканамічнага росту і інфляцыі, якія знаходзяцца пад кантролем. «Два гады таму мы адмовіліся ад абмежаванняў у нашай дзейнасці ў Беларусі. Гэта дазволіла нам істотна актывізаваць нашу работу па інфраструктурных праектах у краіне». У прыватнасці, гэта датычыцца падтрымкі праекта будаўніцтва другой мінскай кальцавой аўтадарогі, рэалізацыі праекта М-10 (паміж Гомелем і Брэстам). Яшчэ адзін кірунак — паляпшэнне сістэмы водазабеспячэння і водаадвядзення. Да таго ж у Мінску плануецца правесці цеплавую мадэрнізацыю будынкаў. Алан Пію таксама расказаў, што ЕБРР зацікаўлены ва ўдзеле ў праектах па рэканструкцыі 22 мастоў, пабудаваных у савецкі час.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Блізкая ўлада

## Пачуць і дапамагчы

**Заўтра аблвыканкамы і Мінгарвыканкам правядуць прамыя тэлефонныя лініі. 9 чэрвеня з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:**

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ (80162213121),

старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ (80212222222),

намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА (80232331237),

намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО (80152735644),

першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА (80222501869),

першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР (80175004160),

намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРАПАК (80172224444).

## З'явілася віртуальная карта бясплатнага Wi-Fi ў Мінску

**Апублікаваная электронная карта падключэння да бясплатнага Wi-Fi ў Мінску. Жыхары і госці сталіцы могуць падключыцца да бясплатнага інтэрнэту ў больш чым ста кропках горада.**

Падрабязная карта знаходзіцца на сайце кампаніі «Дзелавая сетка» па адрасе: https://bn.by/freewifiminsk. Сярод месцаў, дзе можна знайсці бясплатны Wi-Fi, ёсць гандлёвыя цэнтры, кафэ, аўтазаправачныя станцыі, аддзяленні банкаў. Усяго на карце пазначана 115 актуальных кропак доступу да грамадскага Wi-Fi. Распрацоўшчыкі абяцаюць, што карта будзе дапаўняцца. Таксама ў «Дзелавой сетцы» адзначылі, што праз некалькі месяцаў на карце з'явяцца кропкі доступу на станцыях метро «Кастрычніцкая» і «Купалаўская».

Усе карыстальнікі карты могуць азнаёміцца з першымі кропкамі рэгіянальных сетак грамадскага Wi-Fi — у Брэсце, Віцебску, Гродне, Магілёве і Маладзечне, якія зараз будуюцца. Чакаецца, што потым яны будуць аб'яднаны ў сетку Free Wi-Fi BY.

Правайдар Free Wi-Fi Minsk не абмяжоўвае карыстальнікаў па працягласці падключэння да інтэрнэту і хуткасці доступу, якая залежыць толькі ад прапускной здольнасці канала. У сэрвісе прысутнічае адзіная аўтэнтыфікацыя. Пры падключэнні да Wi-Fi карыстальнік праходзіць гэтую працэдуру толькі аднойчы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

# ЁСЦЬ ЗАКОН!

**Учора адбылося пасяджэнне чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання, на якім дэпутаты разгледзелі дзесяць пытанняў.**

## Аптымізацыя не пагаршае якасць

Законапраект «Аб унясенні змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь» прадставіў **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ.** Адказваючы на пытанне дэпутата Андрэя Рыбака з нагоды аптымізацыі колькасці супрацоўнікаў МУС, ён адзначыў, што працэс рэфармавання завершаны. «І вынікам гэтага працэсу з'явілася скарачэнне на 10 % супрацоўнікаў усіх органаў і падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў», — сказаў міністр.

Па словах Ігара Шуневіча, скасаваны некаторыя падраздзяленні: у прыватнасці, палкі патрульна-паставой службы з усёй вертыкаллю іх кіраўніцтва, скарочана галоўнае ўпраўленне камандуючага ва ўнутраных войсках — гэта міністр казаў пра палкоўніцкія і падпалкоўніцкія пасады. Такім чынам, фактычна была прыбрана досыць вялікая колькасць кіруючага складу, аднак без страт у якасці, аб чым кажа статыстыка злачынстваў і грамадскай бяспекі, дадаў Ігар Шуневіч.

## Сотні тысяч еўра заахвочванняў

Пазней у размове з журналістамі Ігар Шуневіч пракаментаваў крымінальную справу па абвінавачанні былога дырэктара вытворчасці РУВП «Папраўчая ўстанова № 5». Нагадаем, паводле афіцыйнай інфармацыі, яго абвінавачваюць у атрыманні хабару ў памеры 207 365 еўра ад прадстаўніка французскай кампаніі. Мэта — рашэнне пытанняў, звязаных з заключэннем і выкананнем дагавораў аб пастаўках за межы краіны мэблі, выробленай на беларускім прадпрыемстве.

«У некаторых краінах, некаторых камерцыйных карпарацыях сакрэтная сістэма заахвочвання пры заключэнні здзелак існуе. Натуральна, што ў нашым заканадаўстве гэтая сістэма называецца хабарніцтвам, таму мы працуем і па выяўленні такіх выпадкаў у сваёй сістэме пры ажыццяўленні фінансава-гаспадарчай дзейнасці», — падкрэсліў ён.

Таксама гучную справу пракаментаваў і **старшыня Следчага камітэта Іван НАСКЕВІЧ.** Паводле яго слоў, адзін з кіраўнікоў папраўчай установы на сістэмнай аснове (на працягу некалькіх гадоў) атрымліваў адкаты за тое, каб частка прадукцыі пастаўлялася за межы краіны. Ён растлумачыў, што расследаванне зацягнулася, паколькі былы дырэктар адмаўляўся ад дачы паказанняў, не прызнаваў віну, праходзіў доўгае лячэнне.

## Дыскрымінацыі ў нас няма

Яшчэ Ігар Шуневіч пракаментаваў заяву МУС у адказ на ЛГБТ-сцяг, які быў вывешаны ў пасольстве Вялікабрытаніі 17 мая. Аднак ён падкрэсліў: меркаванне прыватнае, не міністра ўнутраных спраў, а беларускага грамадзяніна. «Гэта была пэўная праверка нашай грамадзянскай супольнасці на сталасць, яна не зусім прайшла гэтую праверку. Ні адна з грамадскіх арганізацый, аб'яднанняў груп асоб не абурылася гэтым фактам і не запатрабавала зняць гэты прадмет, які, дарэчы кажучы, быў вывешаны ў парушэнне Венскай канвенцыі аб дыпламатычных адносінах. На жаль, ні рэлігійныя арганізацыі, ні грамадскія не адрэагавалі на гэта. Можа быць, мы сапраўды вельмі сур'ёзна талерантны народ у гэтым сэнсе», — падкрэсліў міністр.

Ігар Шуневіч адзначыў, што ніякай дыскрымінацыі ў нас няма, ёсць правілы суіснавання акрамя законаў, якія павінны паважаць усе, у тым ліку і прадстаўнікі замежных дзяржаў. У гэтым таксама ёсць дыпламатыя, плюралізм: ёсць адно меркаванне, павінна існаваць і іншае меркаванне, дадаў ён.

## Ёсць парушэнне — ёсць рэакцыя

Міністр унутраных спраў таксама расказаў пра сітуацыю з затрыманнямі на сталічнай вуліцы Зыбіцкай. У мінулыя выхадныя супрацоўнікамі міліцыі за распіццё спіртных напояў на набярэжнай ракі Свіслач паблізу названай вуліцы, а таксама за знаходжанне ў стане алкагольнага ап'янення былі затрыманы некалькі дзясяткаў чалавек.

Ігар Шуневіч падкрэсліў: ёсць рэакцыя на аператыўную абстаноўку. Шэраг грамадзян заяўлялі, што ў гэтай частцы горада адбываліся дробныя правапарушэнні, пасля чаго рушылі ўслед пэўныя мерапрыемствы.

«Ёсць закон, які кажа пра тое, што існуе адказнасць за знаходжанне ў стане алкагольнага ап'янення ў грамадскім месцы, распіццё алкаголю ў грамадскім месцы і гэтак далей. Мы рэагуем толькі на парушэнне закона», — падкрэсліў ён.

## Выкрыцці працягваюцца

У кулуарах парламента **старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерый ВАКУЛЬЧЫК** расказаў журналістам, што былі затрыманы некалькі высокіх службовых асоб, устаноўлены шматлікія факты хабараў на дзясяткі тысяч долараў. З таго, што даказана, — гэта 140 тысяч долараў за год, аднак сумы будуць расці. На працягу 10 дзён, а максімум — двух тыдняў будуць апублікаваныя падрабязнасці, паабяцаў Вакульчык.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

# «АДКРЫТА, ПРАЗРЫСТА...»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

У цэнтральным апараце Камітэта дзяржкантролю і нашых абласных камітэтах арганізавана работа гарачай лініі, таксама будзе весціся асабісты прыём абітурыентаў і іх бацькоў. Ад таго, наколькі аб'ектыўна і справядліва будуць вырашаны ўсе спрэчныя пытанні — а, зыходзячы з вопыту папярэдніх гадоў, без іх, хутчэй за ўсё, не абыдзецца, — залежыць упэўненасць і маладога пакалення, і іх бацькоў у тым, што дзяржава стварае для кожнага грамадзяніна роўныя ўмовы для яго самарэалізацыі.

— Любы зварот абітурыентаў і іх бацькоў, адрасаваны членам дзяржкамісіі як паўнамоцным прадстаўнікам Прэзідэнта краіны, павінен быць аператыўна і аб'ектыўна разгледжаны: без валакіты і адфутбольвання, — падкрэслівае **старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў, намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО.** — Нельга дапускаць канфліктных сітуацый. Усё павінна праходзіць у добразычлівай атмасферы, а ўсе адказы павінны быць аргументаванымі. Несумненна, вынікі ўступнай кампаніі маюць важнае сацыяльнае значэнне, паколькі закранаюць інтарэсы многіх: абітурыентаў, іх бацькоў і сваякоў, настаўнікаў і выкладчыкаў. Упэўнены, што работа дзяржкамісіі ў цесным кантакце з КДК і Міністэрствам адукацыі спрыяе стварэнню адкрытага, празрыстага і дэмакратычнага механізма фарміравання студэнцкай аўдыторыі. На працягу апошніх сямі гадоў у краіне не было выяўлена фактаў карупцыі пры паступленні абітурыентаў ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Мы пераканаліся, што ўсе ўстановы адукацыі і камісіі, якія ажыццяўляюць кантроль, гатовыя да ўступнай кампаніі і разумеюць задачы, якія перад намі стаяць.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Васіль Жарко адзначыў правядзенне вялікай падрыхтоўчай работы, якая таксама была арыентавана на забеспячэнне роўных умоў для ўсіх абітурыентаў, у прыватнасці, па карэкціроўцы зместу тэстаў: «Мы стварылі рабочую групу з настаўнікаў пераважна агульнаадукацыйных школ (гімназій было вельмі мала), задачай якіх было зрабіць так, каб змест тэстаў адпавядаў праграме звычайнай сярэдняй школы, а не гімназіі. Такім чынам мы ствараем роўныя ўмовы і для выпускніка звычайнай сельскай школы, і для выпускніка славутага ліцэя. Да таго ж сёлета ўпершыню ва ўсіх абітурыентаў, незалежна ад месца іх пражывання (у горадзе або ў сельскай мясцовасці), была магчымасць прайсці рэпетыцыйнае тэсціраванне бясплатна. Гэта стала магчымым дзякуючы дыстанцыйнаму рэпетыцыйнаму тэсціраванню, якое любы ахвотны мог здаць не выходзячы з дому.

Магчымасць здачы чатырох тэстаў замест трох, на думку Васілія Жарко, таксама ідзе абітурыентам на карысць, паколькі не абмяжоўвае іх выбар нейкай адной спецыяльнасцю і павялічвае шанцы не застаўца па-за бортам. Між іншым, 48 працэнтаў абітурыентаў зарэгістраваліся сёлета на чатыры тэсты, а дзве мовы (і рускую, і беларускую) будуць здаваць 14 працэнтаў агульнай колькасці. Што датычыцца рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне, то колькасць тых, хто пажадаў здаваць ЦТ, зменшылася сёлета амаль на 10 тысяч у параўнанні з папярэднім годам. Ці азначае гэта, што зменшаецца і канкурэнцыя на ўваходзе ў ВНУ?

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** нагадаў, што з гэтага года ўступае ў дзеянне норма, якая дазваляе абітурыентам скарыстацца леташнімі сертыфікатамі. І не выключана, што знойдуцца тыя, хто гэтым правам скарыстаецца. Але варта памятаць, што прахадныя балы па першым профільным прадмеце павысіліся сёлета на пяць пунктаў. Штю да кантрольных лічбаў прыёму ў ВНУ, то яны сёлета зменшыліся. Так, прыём на дзённую бюджэтную форму навучання ў ВНУ будзе скарочаны на 1,8 %, а на завочную бюджэтную — на 8 %. Кантрольныя лічбы прыёму на платную форму навучання ў ВНУ зменшыліся на 19,1 % у параўнанні з 2017 годам. На ўсе формы навучання (і бюджэтную, і платную) плануецца прыняць 54,4 тысячы чалавек.

Ігар Карпенка праінфармаваў, што зараз вядзецца падрыхтоўка новай рэдакцыі Правілаў прыёму для атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якая распрацоўвалася з улікам прапаноў членаў дзяржкамісіі. «Усе заўвагі, што паступяць ад дзяржкамісіі па выніках сёлетняй прыёмнай кампаніі, мы таксама гатовы ўлічыць», — паабяцаў міністр.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Здарэнне

# Пашкодзілі капоты пяці аўтамабіляў

**Прыблізна апоўдні ў сталічную міліцыю паступіла паведамленне ад мужчыны, які расказаў, што на вуліцы Ляўкова двое невядомых бегаюць па капотах аўтамабіляў.**

На месца здарэння неадкладна выбылі супрацоўнікі Кастрычніцкага РУУС, якія «па гарачых слядах» затрымалі зламыснікаў. Імі былі два работнікі адной са сталічных устаноў па вуліцы Зыбіцкай.

Затрыманыя раслумачылі, што пасля цяжкай працоўнай ночы вырашылі адпачыць. Яны ўжывалі спіртныя напоі, затым паехалі дадому. Па інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, хлопцы былі настолькі п'яныя, што на вуліцы Ляўкова заскочылі на капоты машын і прабегліся па аўтамабілях. Сваімі дзеяннямі яны пашкодзілі капоты пяці транспартных сродкаў, прычыніўшы тым самым маёмасную шкоду іх уладальнікам.

Па артыкуле за хуліганства заведзена крымінальная справа. Хлопцаў можа чакаць арышт або абмежаванне волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленне волі на тэрмін ад аднаго года да шасці гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПАЙШЛА З ЖЫЦЦЯ КІРА МУРАТАВА



Рэжысёр Кіра Муратава памерла на 84-м годзе жыцця. Яўген Галубенка, муж кінарэжысёра, паведаміў пра трагічную падзею, перадае Buro 24/7. «Пайшла Кіра... з ёй цэлая эпоха...» — заўважыў журналіст і тэлепрадзюсар Юрый Мінзянаў у сваім «Фэйсбуку». Муратава напісала сцэнарыі і зрэжысіравала шэраг фільмаў, сярод якіх вылучаецца «Астэнічны сіндром», які заваяваў спецыяльны прыз журы 40-га Берлінскага кінафестываля і кінапрэмію «Ніка» за найлепшы гульнявы фільм. У яе карцінах здымаліся Уладзімір Высоцкі, Алег Табакоў, Рэната Літвінава. У 2012 годзе Муратава выпусціла свой апошні фільм «Вечнае вяртанне» і заявіла аб сыходзе з кінематографа. Бывайце, Кіра Георгіеўна...

## У НОВЫМ ІСПАНСКІМ УРАДЗЕ БОЛЬШАСЦЬ ПАСАД ЗАНЯЛІ ЖАНЧЫНЫ

Пра гэта новы кіраўнік урада Іспаніі Педра Санчэс аб'явіў на прэс-канферэнцыі пасля таго, як прадставіў склад свайго кабінета каралю Феліпэ VI. З 17 пасад міністраў 11 занялі жанчыны. Па словах Санчэса, гэта сведчыць аб тым, што прыярытэтам урада будзе забеспячэнне раўнапраўя паміж мужчынамі і жанчынамі. «Хачу падзякаваць людзям, якія ўвойдуць у каманду, што яны прынялі прапанову, каб служыць краіне і грамадзянам», — сказаў Санчэс. Ён адзначыў, што новы склад Кабінета міністраў «павінен супрацьстаяць выклікам XXI стагоддзя», сярод якіх тэрарызм, карупцыя, арганізаваная злачыннасць.

## У ІАРДАНІІ — НОВЫЯ ПРАТЭСТЫ

Прызначэнне новага прэм'ер-міністра і абяцанне караля перагледзець ужо падрыхтаваную падатковую рэформу не знізілі напалу пратэстаў у Іарданіі. Пратэстоўцы выступаюць супраць увядзення ў дзеянне праграмы, ухваленай МВФ, якая прадугледжвае меры жорсткай эканоміі, у тым ліку і ўзмацненне падатковага цяжару. Як вядома, у панядзелак ранейшы Кабінет міністраў падаў у адстаўку, пасля чаго кароль Абдала II заклікаў «да перагляду сістэмы падаткаабкладання» і да дыялогу з прафсаюзамі. Напярэдадні стала вядома, што прафсаюзы вырашылі прыпыніць усеагульную забастоўку, але заявілі, што патрабаванне адклікання новых падатковых законаў з парламента застаецца.

## ІЛЮМІНАТАРЫ ЗНІКНУЦЬ З САМАЛЁТАЎ



Арабская авіякампанія Emirates заявіла пра свае планы адмовіцца ад ілюмінатараў на самалётах. Пра гэта паведамляе BBC News. Паводле інфармацыі прадстаўнікоў Emirates, замест іх у салонах лайнераў з'явяцца віртуальныя вокны, на якіх будзе адлюстроўвацца праекцыя малюнка, знятага вонкавымі камерамі. «Выявы будуць выглядаць больш якасна і натуральна, чым калі б вы глядзелі ў ілюмінатар на свае вочы, — расказаў прэзідэнт кампаніі Цім Кларк. — Самалёты стануць лягчэйшыя, будуць лётаць хутчэй, вышэй і марнаваць менш паліва». Ён таксама адзначыў, што нововаўвядзенне павысіць узровень бяспекі.

## Надвор'е

# СПЯКОТА ВЯРТАЕЦЦА

**На наступным тыдні па паўднёвым захадзе краіны чакаецца нават да плюс 29 градусаў**



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

**У найбліжэйшы час уплываць на надвор'е будзе вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі па поўначы адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу. Чакаецца пераменная воблачнасць і пераважна без ападкаў. Аднак радуе тое, што на змену халоднаму антыцыклону з замаразкамі прыходзіць цёплы антыцыклон, перадае Белгідрамет.**

У суботу і нядзелю наша краіна апынецца пад уплывам антыцыклону са Скандынаўскага паўвострава. Будзе пераважна без ападкаў. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, па паўночным усходзе будзе халадней — ад 3 да 6 цяпла. Днём паветра значна прагрэецца і будзе ад плюс 18 да плюс 25 градусаў, у паўднёвых раёнах аж да 26—28 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня будзе па-летняму цёпла і без ападкаў. У панядзелак тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, удзень — 20—26 цяпла. Па паўднёвым захадзе ўначы будзе 15—16, удзень — 27—29 цяпла.

Па звестках Белгідрамета, па-ранейшаму ў шматлікіх рэгіёнах краіны назіраецца дэфіцыт ападкаў. За май і першыя дні чэрвеня па краіне ў асноўным выпала каля паловы нормы ападкаў, а ў некаторых рэгіёнах і таго менш. Напрыклад, у Жлобінскім раёне ў чэрвені наогул не было дажджу, а за мінулыя паўтара месяца выпала толькі 10 % ад кліматычнай нормы. Віной таму перавага антыцыклянальнага характару надвор'я. І ў наступныя дні змены сітуацыі не чакаецца...

**Сяргей КУРКАЧ**

## Відавочная справа

# НЕ ТОЛЬКІ ШКЛЯНКА ВАДЫ

**Валанцёры гатовы прапаноўваць ініцыятывы, але ім важна ведаць вынікі сваёй працы**

**Такую думку выказала Генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольга МЫЧКО. «Сёння каля 70 працэнтаў нашых добраахвотных памочнікаў складае моладзь. І гэта вельмі дзівіць замежных калег, — расказала яна падчас прэс-канферэнцыі. — У Даніі, напрыклад, валанцёрамі часцей за ўсё становяцца пажылыя людзі. Фраў, якія не абцяжараны клопатам пра ўласных унукаў (што нетыпова для нашых бабуль і дзядуляў) з ахвотай займаюцца чужымі дзецьмі. У Беларусі ж самымі актыўнымі застаюцца маладыя людзі».**

Пры гэтым неабавязкова іх дапамога ўключае тую самую «шклянку вады для старога». Некаторыя памочнікі забяспечваюць інфармацыйны фон, іншыя працуюць з фатаграфіямі, а камусьці лягчэй сыходзіцца з людзьмі, удзельнічаць у флэшмобах і масавых мерапрыемствах ад таварыства.

Як прыклад, можна ўспомніць суполку мінскіх студэнтаў, што звярнуліся ў аддзел Чырвонага Крыжа з прапановай смехатэрапіі ў бальніцах. Каманда Smile Rangers (так яны называюць самі сябе) займаецца з дзецьмі, якія праходзяць доўгатэрміновае лячэнне ў бальніцах, карэкцыйных цэнтрах, жывуць у дзіцячых прытулках.

— Мы не даём дапамогу і не прымушаем да добрых спраў «з-пад палкі». Таварыства аказвае падтрымку сацыяльна ўразлівым слаям насельніцтва, наколькі дазваляюць магчымасці. Аднак прыцёка для добрых спраў велізарная, і таму задача Чырвонага Крыжа — паказаць, дзе магчымасці кожнага ўдзельніка прынясуць найбольшую карысць, — тлумачыць Вольга Мычко.

Апошнім часам цягу да сацыяльнай актыўнасці выказваюць не толькі студэнты, але і людзі 30—40 гадоў, прычым іх дзейнасць шыроканакіраваная. Яны ўступаюць у каманды па пошуку людзей, удзельнічаюць у мерапрыемствах па рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі, вядуць уласныя праекты...

Пра пратэкцыі Чырвонага Крыжа чалавек зможа данесці і рэалізаваць ідэю. Усяго ў краіне задзейнічана больш за 140 мясцовых ініцыятыў, не лічачы міжнародных праектаў. Адначасова таварыства з'яўляецца псіхалагічным і матывацыйным «фільтрам» для новых удзельнікаў. Спецыялісты ацэньваюць карысць ініцыятывы і яе ўстойлівасць, а таксама асаблівасці псіхалагічнага стану чалавека, які мусіць працаваць з іншымі людзьмі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

■ Разумныя грошы

# ЦЯПЕР СМАРТФОН ЯШЧЭ І КАШАЛЁК

## У краіне з'явілася першая віртуальная картка з кэшбэкам

**Яе сумесна з плацежнай сістэмай Visa і банкам «Рашэнне» запусцяў з 5 чэрвеня ўпершыню на нашай тэрыторыі аператар velcom.**

Віртуальная картка дазваляе здзяйсняць плацяжы ў АРІПе (ад «камуналкі» да мабільнай сувязі), купляць тавары ў інтэрнэт-крамах і аплачваць таксі. З дапамогай карткі v-banking таксама можна забраніраваць нумар у гатэлі ці ўзяць напракат аўтамабіль у сістэмах анлайн-букінг. Карыстацца карткай ад velcom можна як у Беларусі, так і ў любой іншай краіне свету.

### Імгненны выпуск

«Віртуалка» выпускаецца на платформе міжнароднай плацежнай сістэмы Visa, а эмітэнтам выступае банк «Рашэнне». Картка намінавана ў беларускіх рублях і выдаецца на год, а само афармленне адбываецца ў некалькі клікаў. Для гэтай мэты дастаткова смартфона — адкрыць рахунак можна аддалена з дапамогай мабільнай праграмы v-banking. Наведваць офіс банка для гэтага не патрабуецца: праграма дазваляе прайсці рэгістрацыю ў міжбанкаўскай сістэме ідэнтыфікацыі (МСІ). Створаная Нацыянальным банкам платформа просіць пазначыць прозвішча, імя, асабісты (ідэнтыфікацыйны) нумар і нумар тэлефона.

Гэтай карткай можна плаціць без камісіі ў інтэрнэце і мабільнай праграме v-banking, у тым ліку ў АРІП. Для большай бяспекі анлайн-пакупак прадугледжаны тэхналогія 3-D Secure і бясплатнае sms-апавяшчэнне.

### Эканомім грошы

Упершыню ў нас віртуальная картка забяспечвае вяртанне часткі грошай — так званы moneyback (грошы назад). Назад на рахунак паступае 2 % з кожнай пакупкі ў інтэрнэце, а на рэшту па картцы налічваецца 3 % гадавых. Што важна, гэта распаўсюджваецца па разліках не толькі з беларускімі, але і з замежнымі крамамі і сэрвісамі. Шкада, але кэшбэк у выглядзе бонусу будзе працаваць толькі 3 першыя месяцы. Далейшы лёс кэшбэку будзе залежаць ад шчодрасці сістэмы Visa, за кошт якой устанаўліваецца гэтая паслуга.

На адзін тэлефонны нумар можна афэрміць толькі адну віртуальную картку. Прычым зрабіць гэта могуць абаненты любога мабільнага аператара. Папоўніць «пластык» можна бясплатна праз «v-кашалёк» і з карткі любога беларускага банка ў праграму v-banking. Акрамя таго, гэта можна зрабіць у АРІП, наяўнымі або з банкаўскіх картак.

«Беларусь выходзіць на новы этап развіцця плацежных інструментаў для бяспечных разлікаў. Упершыню віртуальная банкаўская картка даступная ў праграме мабільнага аператара. Афэрміць яе можа кожны чалавек са смартфона, пры гэтым не важна, якім банкам або аператарам ён карыстаецца. Усё адбываецца за лічаныя секунды, без лішніх фармальнасцяў і пытанняў. Віртуальная картка v-banking дэманструе, якія магчымасці адкрывае спажыўцам аб'яднанне намаганняў сектара тэлекамунікацый і фінансавай сферы», — адзначыў **намеснік гендырэктара па маркетынгу, продажах і абаненцкім абслугоўванні кампаніі velcom Роберт ДАШАН.**




### У якасці дадатку

Рынак віртуальных картак можа стаць адным з самых хуткарослых. «Попыт на іх расце ва ўсім свеце, у тым ліку і ў нашай краіне. Бурнае развіццё сферы анлайн-гандлю і інтэрнэт-плацяжоў стымулююць цікавасць насельніцтва да простых і надзейных інструментаў для разлікаў у глабальным сеціве, — звярнуў увагу **рэгіянальны менеджар кампаніі Visa ў Беларусі, Малдове і Азербайджане Ігар КАВАЛЁЎ.** — Усё часцей віртуальныя карткі афармляюць у дадатак да тых, што ўжо адкрыты, каб забяспечыць больш ўзровень бяспекі. Пры гэтым іх функцыянал пастаянна пашыраецца: у прыватнасці, адной з новых фішак віртуальнай карткі v-banking стане наяўнасць кэшбэку, што мае вялікае значэнне для спажыўца».

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Факт

## Ёсць мільён білетаў праз інтэрнэт!

**Беларуская чыгунка вызначыла мільённага інтэрнэт-пасажыра па даных маніторынгу з пачатку 2018 года.**

Праязны дакумент быў набыты анлайн на сайце poezd.rw.by 1 чэрвеня. Мільённы інтэрнэт-пасажыр 2018 года здзейсніў паездку ў гэты дзень на цягніку № 371 па маршруце Мінск — Лунінец.

Беларуская чыгунка ўдзяляе вялікую ўвагу развіццю безнаяўных разлікаў пры аплаце паслуг чыгуначнага транспарту, нагадалі ў прэс-службе магістралі. Удзельная вага продажу білетаў праз інтэрнэт (ад агульнай колькасці праязных дакументаў, афармленых праз АСК «Экспрэс» у білетных касах БЧ) за 5 месяцаў 2018 года склала 20,7 працэнта.

## Каму халадніку на кефіры?!

**Тыдзень беларускай кухні пройдзе ў Мінску з 11 па 17 чэрвеня, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Мерапрыемства адбудзецца ўжо 17-ы раз, калі кавярні і рэстараны сталіцы зноў аб'ядноўцца дзеля папулярызацыі нацыянальнай кухні і развіцця культуры харчавання. На працягу тыдня 77 розных па фармаце і тыпе аб'ектаў грамадскага харчавання прапануюць гасцям пяць страў нацыянальнай кухні па адзінай цане. У спецыяльнае меню, якое адпавядае сезону, увайшлі: летняя агароднінная салата з хатнім тварагом за 3,5 рубля, халаднік на кефіры з печанай бульбай за 2,5 рубля, лапуны з грудзінкай і грыбным соусам за 7 рублёў, мачанка з блінамі за 9 рублёў, бярозава-мядовы напой за 2 рублі.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Рэпарцёр

# ШКОЛА: НІ ДЗЯЦЕЙ, НІ... ГУСЕЙ

**Карэспандэнт «Звязды» разам з супрацоўнікам Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці пабываў у школах, якія зачынілі. Падчас папярэдняга маніторынгу высветлілася, што пра захаванасць будынкаў часцей за ўсё думаюць мала.**

### Закрылі і прадалі за адну базавую

Паводле інфармацыі ўпраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама, за сем гадоў аптымізацыі дзейнасці ўстаноў адукацыі было закрыта больш за 210 школ і садкоў, пераважна ў сельскай мясцовасці. Робіцца гэта з-за недахопу дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту, таму малакамплектныя ўстановы закрываюць.

Вядома, дзяцей і падлеткаў пераводзяць у іншыя, арганізуючы падвоз школьнымі аўтобусамі. Гэта гадамі адпрацаваная практыка, якая сябе апраўдвае.

Дарэчы, грошы, што эканомяцца ў выніку аптымізацыі, накіроўваюцца выключна на тую ж адукацыю. Будынкі прадаюць «з малатка», нярэдка — за адну базавую. Напрыклад, так адбылося з былой Гуркінскай базавай школай у Гарадоцкім раёне, будынак якой быў прададзены за адну базавую велічыню фермерскай гаспадарцы «Аляксандраў слімак» у ліпені 2016 года. Цяпер там актыўна вядуцца рамонтныя работы, адноўлены інжынерныя камунікацыі. Частка памяшканняў выкарыстоўваецца пад цэх па вытворчасці мэблі з дрэва і кавальскай вытворчасці. Частка памяшканняў будзе выкарыстоўвацца як прыдарожнае кафэ.



Школа ў вёсцы Пішчалава Аршанскага раёна.

Ці яшчэ адзін станоўчы прыклад уключэння ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца.

У ліпені 2014 года УП «ФрэйзБуд» за базавую велічыню купіла будынак школы ў вёсцы Паліцы Бешанковіцкага раёна. Там плануецца размяшчэнне цэха па рамонце электрычных рухавікоў, вытворчасць драўляных вырабаў. Завезена і ўстаноўлена неабходнае абсталяванне, дадаткова створаны тры рабочыя месцы.

Але сустракаюцца і факты, мякка кажучы, безгаспадарчасці. У Камітэце дзяржкантролю насцярожваюцца, што будынкі, пасля таго як вучэбны працэс там спыняецца, часта пакідаюць без пільнай увагі.

У прыватнасці, у вёсцы Пішчалава Аршанскага раёна кантралёры падчас папярэдняга маніторынгу ўбачылі, што чыгунныя радыятары былі чамусьці адрэзаны ад труб і ляжалі на першым паверсе. У школьнай майстэрні не ў поўнай камплектацыі стаялі два станкі для апрацоўкі металу.

### Што змянілася за гэты час?

Да заўваг прыслухаліся і аднавілі сістэму ацяплення. Другое пытанне: чаму гэта зрабілі толькі пасля таго, як умяшаўся Камітэт дзяржкантролю?

Нам паказалі школу сёння. Быццам бы ўсё як павінна быць. Вартаўнік сочыць, каб не было выпадкаў вандалізму. Парадак і ў двары.

Што датычыцца перспектыў параўнальна вялікага двухпавярховага будынка, то яго плануюць выстаўляць чарговы раз на аўкцыён, цяпер ужо за базавую велічыню. Няўжо ў населеным пункце, які кіламетраў за шэсць ад райцэнтра, ранейніхто не хацеў купіць такі, можна сказаць, палац? Канешне, параўнанне з Мінскім раёнам, дзе чарга пакупнікоў на нерухомасць, напэўна, лішняе. Але, як вядома, Аршанскі сёння актыўна развіваецца.

### Хоць фільм ваенны здымай

У вёсцы Кляны Дубровенскага раёна таксама школа ў два паверхі, але будынак не такі вялікі ў параўнанні з тым, што на Аршаншчыне.

Адразу відаць, што за тэрыторыяй вакол былой школы ніхто не сочыць. Вокны і дзверы быццам наспех заколочаны. Унутры — беспарадак. Смецце адсюль, бадай, трэба вывозіць гадзінамі. Каму належыць будынак?

У аддзеле адукацыі райвыканкама ўдакладнілі, што ён некалькі гадоў таму быў прададзены за адну базавую велічыню фермеру. Той планаваў разводзіць там гусей. І дзе яны? Высветлілася, што суседствам з чарадой птушак былі незадаволеныя вяскоўцы. Скардзіліся ў розныя ўстановы. Узніклі праблемы і са службай санітарнага нагляду.



Школа ў вёсцы Кляны Дубровенскага раёна.

Гаспадар, дарэчы, меў права нават разабраць будынак, каб выкарыстаць будаўнічыя матэрыялы для сваіх патрэб, або яго прадаць, але чамусьці не зрабіў гэтага. У выніку будынак цяпер больш нагадвае тое, што можа застацца пасля ваенных дзеянняў. Напрыклад, няма драўлянай падлогі, якую расцягнулі некаторыя з тутэйшых. Дарэчы, гэтым фактам займалася міліцыя.

А што фермер? З'ехаў у адну з краін з ЕС. Цяпер былую школу вярнулі ў маёмасць дзяржавы і зноў будуць спрабаваць прадаць, але ўжо больш рупліваму гаспадару.

У Камітэце дзяржкантролю нагадваюць мясцовым уладам, што трэба забяспечваць захаванасць дзяржаўнай маёмасці і не дапускаць прычынення шкоды. І неабходна актыўна далучаць дзяржаўную маёмасць, якая не выкарыстоўваецца, у гаспадарчы абарот. Вінаватыя прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Пытанне і надалей будзе знаходзіцца пад пільным кантролем.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**




## УРОКІ ДЛЯ ПАЧАТКОЎЦАЎ

Вядомую ці не ўсім камбінацыю з трох пальцаў у маёй роднай вёсцы звалі хвігай. Не скажу, што часта яе паказвалі... Хіба ў сварках калі-нікалі, і тое жанчыны альбо дзеці. Сярод мужчын ні дзеі такой, ні слова і наогул не было б, калі б...

Нас, хлапчукоў, у падлеткавым узросце пачыналі прывучаць да касы. На гэты выпадак яна была адмысловая — невялічкая, спецыяльна для пачаткоўцаў.

Мне яе бацька ўручыў у няпоўныя дванаццаць: зайшоў ззаду, паклаў свае рукі на мае — паказаў як трымаць, як касіць, потым — як мянціць (у нас кажуць сцябаць...), каб, крый бог, не парэзацца.

Здалося, простая навука, анічога складанага, тым больш што касіць мне даверылі асаковае балотца. Крыху вышэй узяўся шчыраваць дзядуля, а самы памежак, дзе найцяжэй, — тата.

Зрэшты, разглядацца, хто там і дзе, часу не было, бо я з імпэтам стаў размахваць касой, пляжыць асаку. Яна мне лёгка давалася, і хвілін праз пяць я ўжо лічыў сябе сапраўдным касцом.

Як і варта было чакаць, рана цешыўся, бо пры чарговым сцябанні левая рука не ўтрымала касу і вялікі палец правай «пацалаваўся» з наклянаным лязом... Прычым «пацалунак» атрымаўся нежартоўны: і крыві было шмат, і болю, пакуль дзядуля не прыклаў ліст лопуху і не скамандаваў, моцна заціснуўшы палец, бегчы дамоў...

Рану мне перавязвала мама, бінту, вядома ж, не шкадавала, і на вуліцу я выйшаў з ладнай «лялькай» на пальцы.

Насіць яе давялося некалькі дзён, прычым з форсам, бо мужчыны, убачыўшы гулю, паблажліва пыталі: «Ну што, малец, даў хвігу касе?» — «Даў», — усміхаўся я. І тым самым нібы ўступаў у клуб дарослых і выбраных, якія, трэба разумець, таксама пачыналі з фігі?

**Іван Сіманёнак,**
*г. Паставы.*

## СВАТАЎСТВО ГАЛЬВАНІКА

Мой бацька амаль усё жыццё адпрацаваў на заводзе і пад настрой (а ўжо за чаркай...) мог гадзінамі расказваць пра свой цэх, яго рабочых.

На мой погляд, самым каларытным сярод іх быў Вася. Мянушку Гальванік ён займеў, трэба разумець, дзякуючы «пасадзе». Ды яшчэ — пастаянным заявам, што яны (гальванікі), сярод розных там пралетарыяў — самая белая косць, чыстыя арыстакраты!

За іншых не скажу, бо не ведаю, а што датычыцца Васі, то ён, мяркуючы па расказах бацькі, «арыстакратам» быў і сапраўды. Ва ўсякім разе дома па гаспадарцы анічогачкі не рабіў — не ўмеў і не хацеў. А таму гадамі жыў на мяжы разводу: заяву на яго жонка не раз падавала і не раз забірала — шкадавала дзяцей. І толькі тады, калі яны выраслі (сын застаўся ў войску «прапарам», а дачка выйшла замуж), адважылася-такі пачаць спачатку: знайшла нейкага ўдаўца, развялася з Васем, размяняла кватэру.

Гальванік у выніку застаўся адзін.

І — голад не цётка — навучыўся ён (потым доўга хваліўся) гатаваць сабе чай, нават пельмені! А вось каб нешта памыць — падлогу, адзежу, бялізну, — гэта, прабачце, ужо зусім не панская справа. Выходзіла, што зноўку трэба жаніцца?

Здавалася б, што працей: мужчына, не стары, не хворы...

Яго з некім знаёмілі, вадзілі ў сваты, але чамусьці ўсё было марна: адна «кандыдатка ў жонкі» была для яго стараватая, другая — не вельмі прыгожая, трэцяя з дачай, дзе трэба працаваць, чацвёртая з дзецьмі, пятая без утульнай кватэры...

Па ўсіх «параметрах» і з нядаўняй пары Гальваніку падыходзіла хіба табельшчыца Надзя. Па маладосці, казалі, яна была вельмі пераборлівай — шмат каго адшывала, аднак гады ішлі, потым ляцелі, у заводскім інтэрнаце яна дажылася да мянушкі «мамачка»...

А таму ў новым доме кватэру чакаць не стала: згадзілася на падмену ў старым, зняла з кніжкі грошы, зрабіла рамонт, купіла мэблю...

Ведаючы гэта, Вася, як толькі мог, стаў набівацца ў госці.

Надзя, як выглядала, не супраць была прыняць, бо яна і праўда шукала мужчыну... Яшчэ і для таго, каб у кухні павесіў карніз, у ванным пакоі — шафку. «Вы ж гэта ўмееце?» — спытала яна ў Гальваніка. «А што там умець?» — пакрыўдзіўся Вася, заспеты знянацку.

І потым адступаць ужо не выпадала: у сяброў па цэху ён атрымаў неабходную кансультацыю, у іх жа пазычыў малаток і тоўсты свярдзёлак, надзеў (сам расказваў) новую кашулю (бо чыстай не было) і выправіўся ў госці.

Надзя, мяркуючы па водарах, што панавалі ў чысцюткай кватэры, нагатавала яго любімых галубцоў, для парадку прапанавала выпіць. Госць адмовіўся. Сказаў: «Потым... Колькі там спраў».

«Значыць, не п'янтос», — з павагай падумала гаспадыня і, можна сказаць, залюбавалася, бо Вася тым часам ужо вызначыў і «ўзгадніў» з ёй найлепшае месца для шафкі, адмераў адлегласць паміж петлямі (шафку, каб не замінала, занёс у прыбіральню, прытуліў да сцяны...

«Што правільна, — падумала Надзя, бо вітальня зусім маленькая, а ў зале — новая падлога, накрыты стол...»).

Вася тым часам ужо прыкідваў, дзе лепш прабіваць дзіркі. Успомніўшы парады сяброў, ён шукаў, «намацваў» свярдзёлкам «праслойку» раствору паміж цаглінамі. І такі знайшоў (праўда, пасля сёмай ці восьмай спробы... Ад чаго на сцяне з'явілася «карціна» «Хрушчы прыляцелі»).

Надзю яна вельмі насцярожыла, аднак Вася яе супакоіў. Сказаў: «Нічога, зараз алебастрам замажам, потым падмалюем, і ўсё будзе «хакей».

«Бач як загаварыў, — страпянулася сэрца жанчыны. — Мусіць, застацца хоча? Сватацца прыйшоў. Трэ было ўзяць шампанскае»...

Хвілін праз пяць першая адтуліна была гатовая. І выглядала яна вельмі сімпатычна. «Во што значыць мужчына, — уздыхала Надзея, — што значыць майстар!»

Другая дзірка давалася яму ўжо горай: свярдзёлак (як выглядала) «упёрся» ў нешта цвёрдае, можна сказаць неадольнае... Мяркуючы разбіць яго, Вася адвёў руку, замахнуўся і...

На той бок сцяны, у прыбіральню, на шафку (хана люстэрку!) абрынуўся важкі паўцагелак з кавалкам тынкоўкі. За ім на абадок унітаза (яму таксама хана!) паляцеў грувасткі свярдзёлак.

Не зразумеўшы толкам, што адбылося, Надзя палыпала трохі вачамі, потым, не хаваючы слёз, насцеж адчыніла ўваходныя дзверы.

Вася (як-ніяк арыстакрат) гэты жэст зразумеў без слоў: згроб сваю адносна чыстую адзежу і выскачыў з кватэры, дзе мог і вельмі хацеў застацца...

Хлопцам потым прызнаўся, што Надзя дзеўка што трэба, што ўсё пры ёй, і калі б не гэны каменьчык...

Дрэннаму танцору, як той казаў, то боты ціснуць, то пінжак замінае.

**В. Камарова,**
*г. Бабруйск.*

## НЕ КАЖЫ ГОП...

Старая ісціна: не бывае так дрэнна, каб не выйшла потым на добрае. Ну мяркуйце самі: у сярэднюю школу (пасля пачатковай) я хадзіў за сем кіламетраў. Гэта, вядома ж, далёка і дрэнна. А з іншага боку — не зусім, бо амаль штодзённая «трэніроўка», дзякуючы якой я стаў добрым спартсменам: досыць пасляхова, маючы невысокі рост, бегаў на 100 метраў, на 200, 400, меў спартыўныя разрады.

Быў чэмпіёнам і потым — сярод студэнтаў.

Ды вось неяк раз давялося мне выступаць на першынстве горада, абараняць гонар інстытута. Дыстанцыя — 400 метраў, у сапернікаў — студэнт па прозвішчы Кудзін. Ён быў вельмі вядомым спартсменам — і не толькі ў горадзе, ездзіў нават на першынство Беларусі!

Карацей, у яго былі ўсе падставы для таго, каб перад стартам паглядзець на мяне як на нейкую дробную кузурку і досыць гучна сказаць:

— Няма тут з кім спаборнічаць... А табе, малеча, лепш наогул збоку пастаяць.

Мы з трэнерам Спартаком Аляксандравічам пераглянуліся, але пярэчыць хлопцу не сталі.

І вось мы на бегавой дарожцы, Кудзін, вядома ж, наперадзе, я — трошкі ззаду, але не адстаю.

— Вася! Паддай! Яшчэ крыху... Чуеш? — на апошнім павароце крычыць мне мой сябар Коля.

І ў мяне адкуль толькі сілы — панёсся так, што на закругленні лёгка абагнаў доўгага як цэп Кудзіна, першым выйшаў на фінішную прамую і перамог!

Мой трэнер, мой сябар Коля тут жа кінуліся да мяне, сталі віншаваць. Кудзін, нічога не разумеючы, стаяў непадалёк.

— Ну, што скажаш пра саперніка? — спытаў у мяне трэнер.

— Ды трапло... Выхваляцца ўмее, а бегаць — не! — выгукнуў я.

Кудзін, пачуўшы гэта, збялеў ад злосці, сціснуў кулакі, здавалася, пойдзе на нас вайной. Але ж не адважыўся. Мусіць, пабаяўся, бо хто ведае, чаго яшчэ чакаць ад «малечы».

**Васіль Пяшэвіч,**
*в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ГОРАД КОЛЕРУ СОНЦА

*(Імпрэсія спакушанага вандроўніка)*

Вы ніколі не задумваліся, якога колеру месца, у якім пашчасціла нарадзіцца і жыць? Ці тыя гарады, у якіх бываеш часта, або толькі аднойчы, або зусім праездам? Нават калі ў іх падобная забудова, калі яны знаходзяцца ў адной краіне, часам зусім побач адзін ад аднаго, — усё роўна колер, нават адценне ў кожнага з іх сваё. Варта толькі прыгледзецца, засяродзіцца — і назаўжды ва ўяўленні гэта месца будзе асацыявацца з пэўным колерам.

Не спрабавалі? Найцікавейшы, я вам скажу, занятак. Я, напрыклад, упершыню папрактыкавалася ў гэтым на Мсціславе. Мы тады паехалі ў гэты старажытны і адзін з самых загадкавых нашых гарадоў па шляхах Караткевіча. (Сталыя чытачы «Звязды», думаю, помняць гэта завочнае падарожжа, якое мы ладзілі па творчых і жыццёвых пуцявінах пісьменніка да яго юбілею.) У Мсціслаў мы ехалі, канешне ж, пад уражаннем ад яго эсэ «Дыяментавы горад», па-добраму зайздросцячы аўтару, якому сярод зімы пашанцавала ўбачыць такое дзіва — калі лёд і снег на мсціслаўскіх пагорках ды вуліцах ззялі пад промнямі сцюдзёнага сонца, бы каштоўныя камяні. Разумеючы, што падобнае ўбачыць наўрад ці давядзецца (хоць бы таму, што на дварэ быў не студзень, а жнівень), усё ж ехалі ў Мсціслаў з цвёрдай упэўненасцю, што ён і нам абавязкова пакажацца ў якім-небудзь адметным колеры.

І — атрымалася. Акурат перад нашым прыездам наваколле накрыла цёплая летняя залева, і яго шчодрая зеляніна дыхала такой чыстай свежасцю, і было яе так шмат, што інакш, чым ізумрудным, горад назваць было нельга. Усе адценні гэтага яркага колеру былі на дрэвах, на траве, на агародках, абвітых дзікім вінаградам, шчодра вымытыя, ззялі ў промнях сонца, якое ўжо хілілася да заходу... Так у маім жыцці з'явіўся свой асабісты Ізумрудны горад, нашмат лепшы, чым казачны, бо быў і застаецца па сённяшні сапраўдным.

А ДАЛЕЙ усё пайшло вельмі проста. Магілёў — глыбока-блакітны, як неба над Дняпром. Гародня — прыглушана-жоўтая, часам нават бліжэй да колеру слановай косці, як старыя муры. Рагачоў — аранжава-рудаваты, як лісце, што падае ў кастрычніку з векавых клёнаў. Полацк — урачыста-белы, як ягоныя светлыя храмы. Брэст — барвова-чырвоны, як водбліскі ліхтароў у байніцах начной крэпасці. Ружовы Салігорск, серабрысты Віцебск, прыглушана-зялёны Слонім, шэра-сіняе Глыбокае, празрыста-шэры Мазыр, духмяна-бэзавы Браслаў...

У далёкіх і блізкіх падарожжах па іншых краінах гэта ўжо таксама не пакідае. І ты ўжо ведаеш, што Вільня — тэракотава-ружовая, Масква — залаціста-жоўтая, Варшава — малахітавая, Рым — сметанкова-белы, Брусель — халодна-сіні. Бірузовая Астана, сталёвы Берлін, Страсбург колеру мальваў... Не пытайцеся, чаму менавіта так, а не інакш, бо няма дакладнага адказу. Гэта тое самае няўлоўнае, што ёсць у карцінах імпрэсіяністаў, — адно ўражанне, адно імгненне, што дзіўным чынам малюе нейкі вобраз. Які наступны раз можа ўявіцца зусім іншым, і з'явіцца новая фантазія, новая варыяцыя на тэму...

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2203.

Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
8 чэрвеня 2018 г. № 23 (456)



стар. 2

«Арганіка» ў законе



стар. 3

Ці ёсць нагода для крыўды?



стар. 16

Прырода чакае гасцей

# ПРАДАЦЬ СВАЁ МАЛАКО ДЗЯРЖАВЕ І ЗАСТАЦЦА Ў ВЫЙГРЫШЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

**У НАШАЙ краіне заўсёды імкнуліся ўдзяляць увагу развіццю асабістых падсобных гаспадарак, заахвочваць — асабліва ў апошні час — прадпрымальніцкую ініцыятыву на вёсцы. Разам з тым для некаторых грамадзян застаецца незразумелай сітуацыя з рэалізацыяй свайго малака дзяржкампаніям. Цікавіць людзей, чаму ў адной вобласці закупачная цана большая, чым у другой, а некаторыя прадпрыемствы наогул не ажыццяўляюць закупку. Мы пастараліся разабрацца ў гэтым пытанні.**

стар. 4

УЛАСНЫ ДОСВЕД

# ПАЧНІ З СЯБЕ

## У Магілёве вырашалі, як узмацніць ролю органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання

**Саветы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання насамрэч вельмі эфектыўная форма работы з насельніцтвам. Актывісты здольны разварушыць нават самых лянівых. Але межаў для дасканаласці, як той казаў, няма. Што і было пацверджана падчас пасяджэння прэзідыума Магілёўскага гарсавета.**

### Спартыўная пляцоўка за свае грошы

Знаходзяцца сярод нас і такія шчодрыя жыхары, аб чым паведаміла **старшыня мікразоны № 1 г. Магілёва Ганна ЦАРАНКОВА,** яна ж намеснік дырэктара сярэдняй школы № 40. Да справы дэпутат падыходзіць творча — гэта, напэўна, і падкупляе насельніцтва. Справаздачу сваю падрыхтавала ў выглядзе відэароліка. Убачанае ўражвае: чыстыя сцяжынкі, абкошаныя ўзбочыны, пафарбаванае дваровае абсталяванне, шмат кветак. Ганна Царанкова запэўнівае, што гэта прыгажосць зроблена пры непасрэдным удзеле насельніцтва. Ёсць і яшчэ шмат чаго такога, што не сорамна паказаць.

Ганна Анатолеўна лічыць, што найбольш актыўная форма прыцягнення людзей — інфармаванне праз газету, улёткі, тэлебачанне, сацыяльныя сеткі. Вельмі станоўчы вынік даюць сустрэчы з дэпутатамі, і школа № 40 з'яўляецца цэнтрам для такіх сустрэч. Людзі гэта добра ведаюць і ідуць.

Ёсць нават рэцэпт работы з найбольш капрызлівымі, тымі, хто прывык трымацца ўбаку ад агульных праблем. «З імі трэба спачатку перагаварыць сам-насам, а потым запрасіць на агульны сход», — падказвае псіхалагічны прыём старшыня мікразоны.

### Падзяка за ўвагу

**Аляксандр ПІКУЛЯ, старшыня мікразоны Падміколле–Падгорная,** вядомы ў горадзе сваёй актыўнай і прынцыповай пазіцыяй. Грамадскай дзейнасцю займаецца 14 гадоў. Пад яго непасрэдным кантролем сем вуліц, восем завулкаў, манастыр і іншыя сацыяльна значныя аб'екты. Ён патрабавальны не толькі ў адносінах да камунальнікаў і ўсіх тых, ад каго залежыць дабрабыт насельніцтва. З жыхарамі, якія не жадаюць улічваць грамадскія інтарэсы, ён не менш строгі. І каб ніхто не расслабляўся, наладзіў рэгулярны кантроль.

стар. 3



Аляксандр ПІКУЛЯ — старшыня з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# ПЕРАПЫНАК СКОНЧАНЫ

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ адзначыў, што наша краіна закупляе ў Чэхіі ў два разы больш, чым яна ў нас. Пры гэтым спікер падкрэсліў, што выраўноўваць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва неабходна без нейкіх абмежаванняў, а з дапамогай канкурэнтаздольнай прадукцыі.**



Фота БелТА.

Сёння Чэхія ўваходзіць у дваццатку асноўных гандлёвых партнёраў краіны. Летась аб'ём тавараабароту павялічыўся на 4,8 % — да $290,2 млн. У Беларусь за мінулы год прыйшло $47,7 млн чэшскіх інвестыцый. Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у нашай краіне зарэгістравана 106 прадпрыемстваў з чэшскім капіталам (без уліку акцыянерных таварыстваў).

Міхаіл Мясніковіч лічыць, што міжпарламенцкае супрацоўніцтва з чэшскімі партнёрамі павінна быць больш дынамічным. «Свайго роду каталізатарам могуць быць групы дружбы, якія створаны ў парламентах нашых краін», — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі. Гэта датычыцца і іншых напрамкаў. «Нам трэба актыўней выкарыстоўваць магчымасці міжнародных пляцовак, двухбаковых кантактаў. У нас вельмі многа ёсць і можа быць сумесных цікавых праектаў і ініцыятыў», — сказаў спікер.

Таксама, на думку старшыні Савета Рэспублікі, Чэхія можа больш актыўна выкарыстоўваць магчымасці Беларусі як члена ЕАЭС. Міхаіл Мясніковіч канкрэтызаваў, што беларускі бок хацеў бы бачыць чэшскіх партнёраў, інвестараў для таго, каб ствараць сумесны бізнес. Ён прапанаваў пашырыць дагаворна-прававую базу. Зараз на разглядзе знаходзіцца амаль дзясятак пагадненняў. Міхаіл Мясніковіч таксама заўважыў, што эфектыўнасць павінна быць не толькі на паперы.

— Заявы аб адыходзе ад глабальнай ці рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі — гэта сур'ёзная пагроза для многіх эканомік, асабліва для малых і сярэдніх, да якіх адносімся мы з вамі. Вядома, трэба ў тым ліку заканадаўчымі інструментамі дабівацца, каб транснацыянальныя карпарацыі не выкарыстоўвалі сваё манапольнае права на глабальных і рэгіянальных рынках. Але ў прынцыпе праз інтэграцыю магчыма вырашаць больш задач, у тым ліку для нацыянальных эканомік. Лепш дрэнная інтэграцыя, чым гандлёвая вайна, — лічыць старшыня Савета Рэспублікі. Таксама Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што беларускі бок выступае за актыўнае эканамічнае і палітычнае супрацоўніцтва з аб'яднанай Еўропай.

Старшыня Камітэта па замежных справах, абароне і бяспецы Францішак Бублан, які ўзначаліў дэлегацыю Сената парламента Чэхіі, пагадзіўся, што зносіны паміж дзвюма краінамі ў мінулым былі не дастаткова актыўныя. У тым ліку і чэрвеньскі візіт сведчыць пра тое, што настаў час гэта змяніць. Тым не менш, на думку спадара Бублана, не трэба быць занадта песімістычнымі, бо існуе цэлы шэраг сумесных прадпрыемстваў. Старшыня камітэта адзначыў, што для Чэхіі таксама актуальная тэма дыверсіфікацыі экспарту, бо 80 % ідзе ў краіне Еўропы, галоўным чынам — у Германію. Акрамя таго, на яго думку, паміж Беларуссю і Еўрасаюзам не хапае рамачнага пагаднення, якое б узмацніла прававую базу.

* * *

Супрацоўніцтву Беларусі і Чэхіі ў галіне высокіх тэхналогій будуць спрыяць парламентарыі. Аб гэтым журналістам заявіў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ** па выніках сустрэчы з дэлегацыяй Сената парламента Чэшскай Рэспублікі, якая адбылася напярэдадні.

Парламентарый адзначыў, што на сустрэчы былі намечаны перспектыўныя кірункі для работы — напрыклад, фармацэўтыка, таксама бакі звярнулі ўвагу на развіццё адносін у галіне высокіх тэхналогій, паколькі гэта ключавое пытанне для абедзвюх краін.

Па словах сенатара, Беларусь і Чэхія будуць знаходзіць такія формы ўзаемадзеяння, якія дадуць магчымасць забяспечыць збліжэнне пазіцый не толькі нашых краін, але і тых саюзаў, у якіх удзельнічаюць абедзве дзяржавы. Ён таксама дадаў, што паколькі ў нашу краіну прыбылі высокапрафесійныя парламентарыі, якія займаюць высокія пазіцыі ў чэшскім парламенце, беларускі бок спадзяецца на пазітыўныя вынікі. «Мы пастараемся не ўпусціць новыя магчымасці для таго, каб надаць дынаміцы незваротны характар», — дадаў Сяргей Рахманаў.

**Надзея АНІСОВІЧ, Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# БЕЗ ХІМІІ

**Яшчэ параўнальна нядаўна размовы журналістаў пра арганічную сельскую гаспадарку не падтрымлівалі ў нашай краіне ні вучоныя, ні аграрыі. Спасылаліся на тое, што ўраджайнасць такой прадукцыі значна ніжэйшая, а цана на яе занадта вялікая. А гэта, маўляў, не адпавядае не толькі інтарэсам вытворцаў, але і ў цэлым дзяржаўнай палітыцы: прадукты павінны быць у прымальную чаргу даступныя, і, што не менш важна, — у дастатковай колькасці. Пры гэтым, канешне, яны павінны быць бяспечныя, што цалкам дасягальна, калі строга прытрымлівацца тэхналогій у аграхіміі.**



**Фота ўзята з сайта фермерскай гаспадаркі «СідСад» (вёска Дашкі Мінскага раёна).**

На гэтым размовы пра арганічнае землекарыстанне, як правіла, заканчваліся. Аднак працэс усё ж такі ішоў. Напэўна, сапраўды, у сучасным свеце немагчыма не патрапіць пад уздзеянне сусветных тэндэнцый і рухацца адасобленым шляхам. Цяпер мы можам сказаць, што арганічныя прадукты сталі рэальнасцю ў нашым жыцці. Праект Закона «Аб вытворчасці і абарачэнні арганічнай прадукцыі» прыняты ў першым чытанні, і цяпер у Палаце прадстаўнікоў вядзецца работа па яго ўдасканаленні.

«Сацыяльная накіраванасць развіцця нашай дзяржавы, дзе ў аснове ўсяго стаіць чалавек і яго здароўе, а таксама выгаднае геаграфічнае размяшчэнне нашай краіны — у цэнтры Еўропы, прадвызначылі далучэнне Беларусі да агульнага сусветнага працэсу развіцця арганічнай вытворчасці», — растлумачыў змену трэнду **Сяргей ЛІЦВІН, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па аграрнай палітыцы,** які адказвае за работу над названым законапраектам.

Дакумент быў унесены ў парламент Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у канцы лістапада мінулага года. Яго распрацоўшчыкі паставілі перад сабой наступныя мэты: развіццё вытворчасці арганічнай прадукцыі, забеспячэнне насельніцтва такой прадукцыяй і яе экспарт, а таксама захаванне і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў пры названай вытворчасці.

Трэба сказаць, што спробы (і досыць паспяховыя) па вырошчванні арганічных прадуктаў у Беларусі ажыццяўляюцца ўжо другое дзесяцігоддзе, але адносіны, якія пры гэтым узнікаюць паміж усімі ўдзельнікамі працэсу, уключаючы спажыўцоў, дагэтуль не рэгулююцца ніякімі спецыяльнымі актамі заканадаўства.

«У 2006 годзе гаспадарчае падраздзяленне беларуска-германскага сумеснага дабрачыннага прадпрыемства «Надзея XXI стагоддзе» стала першай таварнай вытворчасцю экалагічна чыстай прадукцыі, хоць пры яе вырабе не выконваюцца цалкам стандарты Міжнароднай федэрацыі арганічнага сельскагаспадарчага руху (IFOAM) па вырошчванні, захаванні і перапрацоўцы, — паведаміў Сяргей Ліцвін. — У 2012 годзе Саветам



Міністраў быў прыняты План выканання мерапрыемстваў па арганізацыі выпуску прадукцыі арганічнага земляробства. Гэты дакумент і актыўнасць грамадскіх арганізацый Беларусі падштурхнулі развіццё арганічнай сельскай гаспадаркі ў нашай краіне».

З таго часу некаторыя фермеры, уладальнікі прысядзібных участкаў і сельскагаспадарчыя арганізацыі пачалі вырошчваць прадукцыю без выкарыстання хіміі і ўпэўніліся, што прадукт гэты запатрабаваны, асабліва за мяжой, дзе людзі знаёмыя з такім таварам.

Ужо ў 2013 годзе дэпутацкая група «Ініцыятыва» склала план па вывучэнні пытанняў вытворчасці арганічнай прадукцыі, а пазней прапанавала распрацоўку праекта адпаведнага закона. Праз тры гады канцэпцыя законапраекта была ўзгоднена з Прэзідэнтам. У свабодным доступе праект закона размешчаны на сайце Мінсельгасхарча.

У дакументе прапісаны патрабаванні да працэсаў вытворчасці і абарачэння арганічнай прадукцыі, называюцца забароненыя пры гэтым сродкі і метады. Напрыклад, забараняюцца выкарыстанне хімічных угнаенняў і сродкаў абароны раслін, генна-інжынерна-мадыфікаваных арганізмаў, сумесная перапрацоўка арганічнай і неарганічнай прадукцыі.

Дакумент прадугледжвае ўвядзенне добраахвотнай сертыфікацыі арганічнай прадукцыі і працэсаў яе вытворчасці. Пры наяўнасці такога сертыфіката вытворцы атрымаюць права наносіць знак «Арганічны прадукт» на спажывецкую і транспартную ўпакоўку.

«Толькі на заканадаўчай аснове можна развіваць добрасумленную вытворчасць і гандаль арганічнай прадукцыяй, у тым ліку абараніць правы спажыўцоў ад падробак, — упэўнены дэпутат, які курыруе законапраект. — Да таго ж адсутнасць у нас нарматыўнага прававога рэгулявання ў галіне арганічнай сельскай гаспадаркі не дазваляе Беларусі паўнавартасна прадстаўляць сябе на міжнародным рынку».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Сёння ў Беларусі налічваецца 20 найбуйнейшых вытворцаў арганічнай прадукцыі: фермерскія гаспадаркі, асабістыя падсобныя гаспадаркі, сельскагаспадарчыя і іншыя арганізацыі. Яны вырошчваюць агародніну і ягады, збожжавыя культуры на прыкладна 1380 га сертыфікаванай ворнай зямлі. Усяго ў краіне сертыфікавана 1,5 тыс. га зямлі. Яшчэ шэсць буйных экспарцёраў бярозавіку, зёлак і лясных ягад маюць 2742 га сертыфікаваных зямель па вырошчванні дзікаросаў.

У нашай краіне зарэгістраваны сем акрэдытаваных у ЕС арганізацый па выдачы сертыфікатаў на вытворчасць арганічнай прадукцыі.

# Фестываль, які збліжае

**Сёлетні міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка» сабраў 600 прадстаўнікоў з пяці краін — Беларусі, Расіі, Балгарыі, Малдовы, Украіны. І хоць свята песеннае і да таго ж дзіцячае, яно прыцягвае ўвагу і дзелавых колаў, у складзе дэлегацый яго наведваюць прадстаўнікі пасольстваў.**



— Мы даём магчымасць нашым высокім гасцям наведаць прамысловыя прадпрыемствы, пазіцыянуем эканамічны складнік нашага раёна, — адзначае **першы намеснік старшыні Клімавіцкага райвыканкама Дзмітрый МАРЦІНОВІЧ.** — Толькі дзякуючы фестывалю наш раён ведаюць як мінімум 23 краіны свету. Клімавічы пастаянна кантактуюць з трыма расійскімі гарадамі — Суражам, Рослаўлем, Шумячамі. Штогод дапамагаем расіянам прыбіраць ураджай збожжавых. Летась, напрыклад, туды выязджалі чатыры камбайны. Сваю прадукцыю ў гэтыя раёны пастаянна вывозіць Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў, на рынку ў Рослаўлі ёсць яго гандлёвыя пункты.

А нядаўна ў раён прыйшоў літоўскі капітал. Вядомая кампанія ARVI збіраецца тут не толькі рэалізаваць свой праект (на 50 мільёнаў долараў) па наладжванні вытворчасці мяса індычкі, але і выступіць на наступны год адным са спонсараў дзіцячага фестывалю. Сваю лепту ўносяць і ганаровыя грамадзяне Клімавіч, якія нарадзіліся ў раёне, імя зрабілі ў Расіі. Генерал-лейтэнант з Масквы Васіль Чэмісаў пабудаваў храм на сваёй малой радзіме ў аграгарадку Звянчатка, што на мяжы з Расіяй. А акадэмік Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук Мікалай Крупінін, які зараз жыве ў Ханты-Мансійску, стварыў мемарыял на месцы ўжо не існуючай вёскі Саўна, дзе нарадзіўся. Гэта населены пункт, з якога ў 1943 годзе пачалося вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ПАЧНІ З СЯБЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Раз на два тыдні абыходзім разам з памочнікамі домаўладанні, а іх у нас у мікразоне 810, — прыводзіць асабісты прыклад Аляксандр Пікуля. — З іх 16 трапілі ў чорны спіс — каля дамоў сапраўдны бардак. Гаспадары трох паабяцалі ўжо, што выправяцца і навядуць парадак.

Што да падтрымання парадку на тэрыторыі Падміколля ў цэлым, то на гэты раз прэтэнзій да камунальных службаў у Аляксандра Васілевіча не было. Наадварот, адны падзякі. Ён нават некалькі з іх напісаў у адрас дарожна-маставога прадпрыемства — за тое, што часткова паклалі асфальтагранулят на вуліцы Ламаносава. Удзячны ён таксама і прадпрыемству «Гарсвятло», якое аператыўна мяняе перагарэлыя лямпачкі, і «Спецаўтапрадпрыемству» — яно своечасова вывозіць смецце. Насельніцтва бачыць, што агульная тэрыторыя ў парадку, і сорамна становіцца за сваю.



Удзельнікі пасяджэння агучвалі набалелыя пытанні.

## Метадычка для старшыні

Найбольш удалымі прыкладамі ўзаемадзеяння з насельніцтвам падзялілася **Ірына РАІНЧЫК, намеснік кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Магілёва, а па сумяшчальніцтве старшыня каардынацыйнага савета па тэрытарыяльным грамадскім самакіраванні пры адміністрацыі раёна.**

— У 2015 годзе мы сабралі метадычны дапаможнік, дзе выкладзены некаторыя прававыя асновы дзейнасці органаў самакіравання, — падкрэсліла яна. — Тут сабрана інфармацыя, пачынаючы ад справаводства і заканчваючы канкрэтнымі дзеяннямі. Гэта, можна сказаць, настольная кніга для старшынь Саветаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

Ірына Анатолеўна адзначае, што добрыя вынікі далі конкурс на самы лепшы падворак і кірмаш сацыяльных праектаў. Адзін з цікавых праектаў — вулічная лаўка з энергаэфектыўнымі зараднымі прыладамі. Магчыма, хутка адна з іх з'явіцца ў парку «Падміколле».

— Не паспеў пачацца год, як людзі ўжо тэлефанавалі, пыталіся, як падаць заяўку на ўдзел у нашых конкурсах, — кажа дэпутат. — Сёлета мы аб'явілі ў «Інстаграме» яшчэ адзін пад назвай «Клумба». Работнікі адміністрацыі Ленінскага раёна вырасцілі расаду і ўпрыгожваюць горад кветкамі. А фота выкладваем у сацыяльных сетках, каб у іншых таксама ўзнікла жаданне наводзіць вакол сябе прыгажосць.

Падчас пасяджэння агучваліся ідэі, як заахвочваць насельніцтва аб'ядноўвацца і вырашаць пытанні сумесна. Часам для ажыццяўлення нейкіх дзеянняў, напрыклад у прыватным сектары, не хапае прававой асновы. Прагучала прапанова стварыць і там нешта накшталт таварыства ўласнікаў. Гэта, магчыма, дапамагло б вырашаць праблемы са стыхійнымі звалкамі, абкосам тэрыторый і гэтак далей.

**Старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Андрэй КІБЛОЎ** прапанаваў дэпутатам больш актыўна прыцягваць да ўдзелу ў навядзенні парадку арганізацыі, прадпрыемствы, прадстаўнікоў прыватнага бізнесу, якія працуюць на канкрэтнай тэрыторыі. Людзі пры пасадах — перш за ўсё жыхары Магілёва, таксама здольны ўносіць свой уклад у стварэнне прыгажосці ў горадзе. Андрэй Кіблоў адзначыў, што пры фарміраванні комплекснага плана па добраўпарадкаванні Магілёва на наступны год упершыню ў гісторыі будуць улічвацца пажаданні не толькі ЖЭУ, але і гараджан. Прыярытэтам будуць карыстацца тыя дваровыя тэрыторыі, дзе людзі самі падтрымліваюць парадак.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### У тэму

**Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Сама ідэя і задача органаў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання — уцягнуць як мага большую колькасць людзей у грамадскае жыццё горада. Ніхто, акрамя нас, не створыць ідэальных умоў для жыцця. Мне вельмі спадабалася работа мікразоны № 1, дзе адзначаецца добрая актыўнасць насельніцтва. І мне падабаецца іх дэвіз: «Хочаш зрабіць жыццё лепшым, пачні з горада, хочаш зрабіць горад лепшым, пачні з вуліцы, хочаш зрабіць вуліцу лепшай, пачні з сябе». Вельмі прыгожа, а галоўнае — правільна. Калі нешта хочаш зрабіць, пачынай з сябе. Часам, маючы зносіны з людзьмі, адчуваеш прысутнасць сацыяльнага ўтрыманства ў падыходах да праблемы. Мы ўсё чакаем, калі хтосьці прыйдзе да нас і нешта нам зробіць: лямпачку памяняе, сметніцу ўстановіць... Сам не хочаш нічога рабіць — плаці грошы. Культуру сацыяльнай адказнасці перад усім, што з'яўляецца грамадскім, трэба выхоўваць. І чым раней пачнём гэта рабіць, тым лепш.

СПРЭЧНЫ МОМАНТ

# ЦІ ЁСЦЬ ПАДСТАВЫ ДЛЯ КРЫЎДЫ,

## а таксама абмежаванні па ўзросце для грамадскай працы?

**Да нас у рэдакцыю звярнуўся мужчына сталых гадоў. Прычым не проста патэлефанаваў, а прыйшоў і гатовы быў чакаць размовы з журналістам столькі, колькі спатрэбіцца. Відаць, накіпела. Каменем спатыкнення стала яго дзейнасць у адным з КТГС — камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання сталіцы. Пасля заканчэння кіраўніцкага тэрміну зноў на пасаду старшыні яго не пераабралі. Мы паспрабавалі разабрацца ў праблеме.**

Васіль Аўдзеевіч Кавальчук нарадзіўся ў 1930 годзе. Маючы зусім няпросты лёс, як і большасць аднагодкаў, з узростам не страціў сваёй энергічнасці і жадання прыносіць карысць. Апошнія чатыры гады ён узначальваў адзін з КТГС Фрунзенскага раёна г. Мінска. У мужчыны было сваё бачанне праблем, якім неабходна ўдзяляць увагу ў першую чаргу. Так, ён як старшыня рабіў акцэнт на асветніцкай рабоце ва ўстановах адукацыі, арганізацыі памятных мерапрыемстваў. Напрыклад, зладзіў тэлемост з калегамі з расійскай ветэранскай арганізацыі з горада Зеленагорска, прысвечаны Міжнароднаму дню міру. Васіль Аўдзеевіч прызнаецца, што дзеці былі пад вялікім уражаннем. Шмат увагі аддавалася і ўзаемадзеянню з мясцовымі жыхарамі. Па словах пенсіянера, усе ведалі, куды несці непатрэбныя рэчы і дзе ў выпадку цяжкай жыццёвай сітуацыі можна атрымаць нешта патрэбнае для сябе.

На сустрэчу Васіль Кавальчук прыйшоў з вялікім стосам дакументаў. У ім — падрабязны план таго, чым ён збіраўся заняцца ў будучыні, і справаздача аб праведзеных мерапрыемствах. Але ўвасобіць у жыццё задумкі не атрымалася: старшынёй выбралі іншага чалавека. З такім рашэннем пенсіянер катэгарычна не згодны: «Я добра ведаю гэтую працу, у мяне яшчэ шмат сіл, людзі да гэтага часу працягваюць да мяне звяртацца! І наогул перавыбары прайшлі незаконна. Ніякіх абмежаванняў па ўзросце членаў камітэта няма».

Як адрозніць жаданае ад сапраўднага? Сапраўды, згодна з законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», абмежаванні ёсць толькі па мінімальным узросце — 18 гадоў. Акрамя таго, член КТГС павінен пастаянна пражываць на тэрыторыі, да якой адносіцца гэта арганізацыя. Што датычыцца кандыдатаў, то яны могуць вылучацца як самімі грамадзянамі, так і гарадскім Саветам дэпутатаў, а таксама выканаўчымі і распарадчымі органамі. Старшыню выбіраюць члены КТГС адкрытым або тайным (па жаданні) галасаваннем на мясцовым сходзе. Пераможцу вызначаюць простай большасцю галасоў.

Менавіта так было і на гэты раз. Праўда, сход прыйшлося праводзіць два разы: першы раз Васіль Аўдзеевіч адмовіўся прызнаваць вынікі галасавання без прысутнасці дэпутата гарсавета. На другі раз дэпутат прысутнічала і цалкам пацвердзіла законнасць таго, што адбываецца. Падчас сходу Кавальчук зрабіў справаздачу аб сваёй дзейнасці за час працы. Члены КТГС прызналі яе здавальняючай, але не выдатнай. Васіль Аўдзеевіч такое стаўленне ўспрыняў блізка да сэрца і катэгарычна адмовіўся ўдзельнічаць у рабоце КТГС не ў ролі старшыні. Пасля чаго пайшоў шукаць справядлівасці ў СМІ.



Члены КТГС і ветэранскай арганізацыі.
Васіль КАВАЛЬЧУК другі злева ў верхнім радзе.

У двух бакоў ёсць яшчэ адзін прадмет для спрэчкі — кладоўка, якую Васіль Аўдзеевіч паспрабаваў ператварыць у куток ветэранаў. Але, як аказалася, у памяшканні неабходна праводзіць рамонт, да таго ж яно не прызначана ні для якіх патрэб, акрамя гаспадарчых. Ды і ў ветэранаў у кожным раёне ёсць камфортныя, прыдатныя для сустрэч памяшканні. Так што не кожная нават на першы погляд добрая ініцыятыва мае пад сабой лагічную аснову.

Мы звязаліся з работнікамі ЖЭС № 17, на тэрыторыі абслугоўвання якога знаходзіцца дадзены КТГС. «Васілю Аўдзеевічу мы прапанавалі стаць намеснікам старшыні, але ён хоча толькі кіраваць. А праца старшыні вельмі напружаная, патрабуе вялікіх выдаткаў энергіі, напору, пажадана, вопыту працы ў сферы ЖКГ, бо разабрацца ва ўсіх тонкасцях не так проста. А Кавальчук — чалавек ва ўзросце, яму трэба сябе берагчы, таму цяпер пасаду кіраўніка заняў больш малады жыхар раёна, але таксама з вялікім жыццёвым вопытам і кампетэнцыяй у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. За ўсю праведзеную працу мы выказваем Васілю Аўдзеевічу велізарную падзяку, гатовы і далей прыслухоўвацца да яго парад. Як толькі ў нас будзе маштабнае раённае мерапрыемства, ён абавязкова атрымае ганаровую грамату. Свой вольны час гэты чалавек якраз зараз можа накіраваць на патрыятычнае выхаванне моладзі сумесна з ветэранскай арганізацыяй — гэта тая тэма, якая заўсёды была яму найбольш цікавай», — расказалі нам у ЖЭСе.

Напэўна, спецыялісты сапраўды маюць рацыю. Тым больш што, як у канцы размовы прызнаўся сам Васіль Кавальчук, ён з'яўляецца інвалідам Савецкай арміі. У свой час удзельнічаў у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Пры размове на гэтую тэму голас пажылога мужчыны дрыжаў, ён пачынаў шукаць таблеткі ў кішэні. Увогуле, уся гутарка давалася яму нялёгка — занадта вялікае значэнне мелі для яго апошнія падзеі. Акрамя дакументаў у Васіля Аўдзеевіча з сабой было некалькі вялікіх стосаў фотаздымкаў — сведчанні яго неабыякавасці да грамадскага жыцця. Разглядаючы іх, яшчэ больш пераконваешся: самае каштоўнае, што ён зараз можа зрабіць — расказаць жыхарам раёна гісторыю свайго напоўненага выпрабаваннямі жыцця. І пастарацца зразумець, што часам найлепшыя дасягненне і дапамога — гэта проста пачуць адно аднаго.

**Дар'я КАСКО.**

# ПРАДАЦЬ СВАЁ МАЛАКО ДЗЯРЖАВЕ...

## ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ?

Для пачатку варта адзначыць, што адзінага рэгулявання закупак малака ў насельніцтва ў краіне не існуе. Як растлумачылі ў прэс-службе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, вобласць, горад, пасёлак — любая з гэтых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак можа рэгуляваць працэс збору і перавозкі лішкаў малака, сабранага ў насельніцтва, да малаказавода сваім асаблівым чынам. Пэўнай адзінай схемы гэтага працэсу, паўторымся, у краіне няма. Збор малака арганізоўваюць сельвыканкамы, гаспадаркі, самі малочныя заводы.

На малаказаводах, як правіла, прымаецца малако высокага — «экстра» і першага — гатунку. Лішкі малака насельніцтва пры зборы часта зліваюцца ў адну ёмістасць, у якой па выніку сыравіна адпавядае першаму гатунку. Паслугі за збор малака пры гэтым часта па дамоўленасці аплачваюць малаказаводы.

Вядома, што малочныя заводы ўмоўна дзеляць паміж сабой тэрыторыю краіны на так званыя сыравінныя зоны. Пэўны завод адказвае за канкрэтныя населеныя пункты, якія прылягаюць да яго. Чаму падзел умоўны? Таму што ніякі дакумент афіцыйна не замацоўвае гэтыя зоны. Вытворца малака з Віцебска тэарэтычна можа прадаць сваю сыравіну ў Гомелі, але тут з'яўляюцца іншыя складанасці. Адна з іх — лагістыка.

Калі прадаць сваё малако ў іншую больш аддаленую сыравінную зону — зыходзячы з таго, што закупачная цана там будзе вышэйшая, — страціць можна ўсё ж больш. Пры перавозцы малако патрабуе пэўных умоў для захоўвання, інакш па дарозе яно папросту скісне. Часцей за ўсё такія ўмовы фермеры забяспечыць не гатовыя. Акрамя таго, сюды варта дадаць і расходы на паліва для транспарту — іх наўрад ці пакрые кошт закупкі на суседнім заводзе.

## ШТО ПАЧЫМ?

Што датычыцца цэнавай палітыкі, то яна таксама ў розных месцах розная і залежыць непасрэдна ад завода. Цана на малако выстаўляецца малочнай кампаніяй зыходзячы з яе становішча. Спецыфіка сыравіннай зоны таксама залежыць ад фінансавага становішча прадпрыемства. Напрыклад, у адзін і той жа перыяд у Віцебскай вобласці малочныя прадпрыемствы могуць танней купляць малако ў грамадзян, чым, напрыклад, гэта робяць у Брэсце. Прычым цана, магчыма, можа змяняцца і ўнутры самой вобласці — у залежнасці ад эканамічнага стану малаказавода.

Мы вырашылі ўдакладніць сярэднюю закупачную цану на некаторых вядомых малочных прадпрыемствах краіны. Напрыклад, у магілёўскай малочнай кампаніі «Бабуліна крынка» за адну тону малака гатовыя заплаціць 495 рублёў. У гомельскай малочнай кампаніі «Мілкавіта» за тону малака плацяць крыху больш за 506 рублёў. У сваю чаргу, у сыравінным аддзеле брэсцкай кампаніі «Савушкін прадукт» расказалі, што наогул не ажыццяўляюць закупу малака ў насельніцтва ў маленькіх аб'ёмах. Гэтым там займаюцца калгасы. Такая сітуацыя, дарэчы, можа стымуляваць грамадзян прадаваць сваю прадукцыю на рынках або здаваць малочных кароў на мяса.

У цэлым сістэма працуе. Адказ на пытанне, куды лепш прадаць малако — на рынак ці на малаказавод — залежыць ад шэрагу фактараў. Аднак для некаторых раёнаў, дзе заводы адмаўляюцца ад збору малака або будуць рабіць гэта па нізкай цане, у насельніцтва, якое хоча зарабіць на сыравіне, могуць узнікаць праблемы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

МЯСЦОВЫ ЧАС

# ЗОРКА НА ПАДВОРКУ

## Ці лёгка даецца «белае золата»?

**ГАДОЎ дваццаць таму карову трымалі амаль што на кожным вясковым падворку. А некаторыя гаспадары мелі іх па дзве-тры і больш. Малако — прадукт незаменны, з яго можна прыгатаваць і смятану, і масла, і тварог, і сыр, і ражанку. І сям'я накормленая, і выдаткі з сямейнага бюджэту на набыццё магазіннай прадукцыі зніжаюцца. Цяпер жа рагуль можна пералічыць на пальцах не тое што ў вёсках, але і ў маштабах раёнаў.**

Малако — крыніца заробку як дзяржавы, так і любой сельскагаспадарчай арганізацыі, грамадзян. Нездарма кажуць: карова ў двары — ежа на стале. Асабліва гэта датычыцца шматдзетных сем'яў.

у асабістых падсобных гаспадарках налічваецца 517 кароў. У мінулым годзе іх было 625. Калі ўспомніць 2010-ы, то людзі трымалі паўтары тысячы. Найбольшая колькасць кароў у Рубяжэвіцкім і Літвянскім сельсаветах, адпаведна — 153 і 115. На жаль, аб'ёмы нарыхтовак малака ад насельніцтва штогод зніжаюцца. На гэта ўплываюць аб'ектыўныя дэмаграфічныя прычыны: вёска старэе. Адпаведна, і малака на прыватных падворках становіцца менш. Райвыканкам, райсавет стараюцца падтрымаць асабістыя падсобныя гаспадаркі, стымуляваць грамадзян, каб лішкі малака здавалі дзяржаве. Штогод мы праводзім раённыя спаборніцтвы па закупках сельскагаспадарчай прадукцыі

на, калі чалавек здаў 100 літраў малака, але тлустасцю 3,4, то ў залік яму ідзе 98 літраў. Калі тлустасць малака вышэйшая за базавую, то ў залік ідзе большая колькасць малака. Так што разбаўляць «белае золата» вадой нявыгадна. Акрамя таго, дадатковыя грошы налічваюцца за здачу маладняку. Разам з сельвыканкамам гаспадарка праводзіць кантрактацыю жывёлы, заключаюцца адпаведныя дагаворы з уласнікамі.

Вядома, ёсць і такія, хто здае толькі частку малака, астатняе пакідае для дзяцей і ўнукаў. Некаторыя грамадзяне прадаюць малочныя прадукты на рынку, дачнікам, сваякам і знаёмым.

— А як наконт кармоў для жывёлы? Гаспадар павінен спадзявацца толькі на



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Працалюбівыя, старанныя гаспадары, якія клапоцяцца пра тое, каб у дзяцей быў хлеб і да хлеба, ніколі не пазбавяцца карміліцы. Пажылыя людзі, што не прывыклі сядзець без справы, таксама не супраць трымаць жывёлу, але ж часта не маюць здароўя і сіл для яе догляду. А моладзь лічыць, што прасцей купіць малочныя прадукты ў краме. Але ўсё ж яшчэ засталіся аматары, якія не ўяўляюць свайго жыцця без жыўнасці ў хляве. Гэта ў асноўным грамадзяне перадпенсійнага ўзросту і маладыя пенсіянеры.

> Ужо цяпер прасочваецца тэндэнцыя, што і ў далейшым колькасць пагалоўя на прыватным падворку будзе змяншацца.

— Зразумела, утрыманне жывёлы — справа клопатная, яна патрабуе вялікай працы, самааддачы, карпатлівага догляду. Трэба рана ўстаць, накарміць, падаіць рагулю, выгнаць яе на пашу, ды і на зіму назапасіць дастаткова сена, набыць камбікорм, — кажа **старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей ШЭСТАЛЬ.** — У нашым раёне

ў насельніцтва, заахвочваем прэміямі як малаказдатчыкаў, так і малаказборшчыкаў. Сёлета ў сакавіку падведзены вынікі за мінулы год.

Найбольш «белага золата» прынялі ад насельніцтва малаказборшчыкі Ганна Коржыч — больш за 31 тону — і Ганна Карневіч — каля 9 тон з Дзераўнянскага сельсавета. Віктар Янушкевіч з Літвянскага сельсавета сабраў 8,5 тоны, Баляслаў Гайдук (Дзераўнянскі сельсавет) — больш за 4 тоны. Пераможцамі сярод здатчыкаў малака сталі Міхаіл Бесь з вёскі Кругавіны Дзераўнянскага сельсавета — 10 тон 155 кілаграмаў, Іосіф Паўлавец з вёскі Вечатарова Старасвержанскага сельсавета — 9 тон 436 кілаграмаў малака.

Дарэчы, людзей, якія збіраюць малако ад насельніцтва, шукаюць і прымаюць на працу старшыні сельвыканкамаў. Гэтыя «давераныя асобы» звозяць прадукцыю ў адзін пункт тры разы на тыдзень гужавым транспартам. Затым машына райаграсэрвіса дастаўляе яе на малаказавод.

— Разлікі са здатчыкамі праводзяцца своечасова. За кожны здадзены кілаграм малака людзі атрымліваюць 43 капейкі — пры яго базіснай тлустасці 3,6. Умоў-

свае сілы ў нарыхтоўцы «правізіі»? — пацікавілася ў старшыні райсавета.

— Па ўзгадненні з сельвыканкамамі арганізацыі выдзяляюць людзям пашу, кармы. Вядома, не пад поўную патрэбу. Але ж ніхто не забараняе людзям нарыхтоўваць сена на няўдобіцах, на берагах і ў поймах рэк, на лясных палянах і прагалінах, — адказаў Сяргей Шэсталь.

*Па яго словах, прасочваецца тэндэнцыя, што і ў далейшым колькасць пагалоўя на прыватным падворку будзе змяншацца. На сітуацыю ўплывае той факт, што вытворчасць малака ў грамадскім сектары з кожным годам набірае абароты. Цяпер, напрыклад, на Стаўбцоўшчыне штодзень атрымліваюць 280 тон малака, а надой на адну карову складае больш як 17 кілаграмаў. Разам з тым становяцца больш жорсткімі патрабаванні да якасці малака. Каб атрымаць выдатную прадукцыю, што адпавядае ўсім нормам, неабходна ўтрымліваць жывёлу ў адпаведных санітарных умовах, правільна карміць, лячыць. Толькі ў гэтым выпадку малако будзе запатрабавана перапрацоўчымі прадпрыемствамі. Дасягнуць жа ідэалу ў хатніх умовах складана.*

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## Уладзімір НАВІЦКІ:

# «НА ЖАЛЬ, Я ТАК І НЕ НАВУЧЫЎСЯ АДПАЧЫВАЦЬ...»

**Самы пазнавальны голас беларускага спартыўнага тэлебачання, безумоўна, належыць Уладзіміру Навіцкаму. У прамым эфіры ён 37 гадоў. Прычым пачынаў яшчэ на савецкім Цэнтральным тэлебачанні, вучыўся і працаваў побач з легендамі спартыўнай журналістыкі, такімі як Мікалай Озераў, Уладзімір Пературын, Уладзімір Маслачэнка... За час сваёй кар'еры і сам стаў легендай: адных толькі Алімпіяд за яго плячыма — 12! Напярэдадні чэмпіянату свету па футболе мы распыталі ў каментатара аб чаканнях ад гэтага турніру і нюансах каментатарскай працы.**



***— Уладзімір Мікалаевіч, хутка стартуе чэмпіянат свету па футболе, і гэта, безумоўна, вялікае свята для балельшчыкаў. А для каментатара тут больш свята ці напружанай працы?***

— Зразумела, турнір такога рангу, як чэмпіянат свету, для кожнага каментатара найперш вялікая адказнасць і чарговая праверка на прафесіяналізм. З той пары, як узнік спартыўны тэлеканал «Беларусь 5», у нас дастаткова каментатараў, у тым ліку і футбольных, таму звышнагрузкі не будзе. У асноўным каментаваць будзем «пад карцінку» — адсюль, з Макаёнка, 9. Але на некалькі стартавых матчаў і на заключныя сустрэчы — матчы за бронзу і фінал, калегі паедуць у Маскву і Санкт-Пецярбург.

Мяне чакаюць 8—9 рэпартажаў. Ужо зараз да іх рыхтуюся, збіраю інфармацыю. Хочацца, каб яна была цікавай, эксклюзіўнай — дзякуй богу, зараз, у эпоху інтэрнэту, яе знайсці лягчэй. Не хочацца расказваць пра тыя факты, якія балельшчык можа прачытаць у ранішняй газеце. Дзякуючы таму, што ведаю англійскую мову, а жонка Святлана, якая скончыла інстытут замежных моў, валодае англійскай і французскай, стараюся знайсці «фішкі» і «цікавінкі» на замежных сайтах.

***— Ці рызыкнеце зрабіць прагнозы на турнір? Хто выйграе?***

— З мяне няважны прагназіст. Ёсць фаварыты, а гэта зборныя, якія па статусе, зорнай абойме гульцоў пераўзыходзяць астатніх, але ў жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу, заўсёды можа быць сюрпрыз. Таму калі перад матчам, турнірам балельшчыкі пры сустрэчы пытаюцца, хто выйграе, адказваю: анатаміраванне пакажа. Упэўнены толькі ў адным: мы станем сведкамі яркіх, цікавых, відовішчных матчаў і нестандартныя камандныя дзеянні будуць добра прыпраўлены праявамі індывідуальнага майстэрства гульцоў.

***— Вы каментуеце матчы яшчэ з савецкіх часоў, прадстаўлялі Цэнтральнае тэлебачанне на чэмпіянаце свету па футболе 1990 года...***

— У маім доўгім каментатарскім жыцці, а яно працягваецца ўжо 37 гадоў, два чэмпіянаты свету стаяць асобна. Гэта турніры, на якіх я працаваў з месца падзей. Сапраўды, у 1990 годзе ад Цэнтральнага тэлебачання, адзінага ў вялікай краіне, у ліку шасці савецкіх каментатараў мне выпаў гонар паехаць на сусветнае першынство. Працаваў разам з Уладзімірам Маслачэнкам, Уладзімірам Пературыным, Яўгенам Маёравым, Катэ Махарадзэ і Генадзем Арловым. У жывых на сёння, на вялікі жаль, засталіся толькі Арлоў і я. Чэмпіянат праходзіў у Італіі ў розных гарадах. Мне пашчасціла расказваць пра 13 матчаў.

Яшчэ быў чэмпіянат свету 2014 года ў Бразіліі, куды я быў камандзіраваны ўжо як каментатар Белтэлерадыёкампаніі, працаваў на матчах на фінішы турніру: сустрэчы плэй-оф, чвэрцьфінале, паўфіналах, гульні за бронзу і фінале. Якім бы вопытам і прафесіяналізмам каментатар не валодаў, значна лягчэй працаваць, калі ты знаходзішся на стадыёне: бачыш усё поле, карціну цалкам. Дарэчы, многія думаюць, што калі мы каментуем адсюль, з Макаёнка, то ў нас экран на вялікую сцяну. Гэта зусім не так — сярэдніх памераў манітор.

***— Што стаіць за каментатарскай працай? Пасля матча каментатарскую пазіцыю пакідаеце эмацыянальна спустошаным ці, наадварот, з натхненнем?***

— Усё залежыць ад зместу матча. Калі там шквал эмоцый, твая задача адпавядаць падзеям. А здараюцца ж і не вельмі цікавыя матчы, тады важна за кошт каментарыя, падачы, уласнай экспрэсіі пастарацца зрабіць відовішча больш яркім. Але якім бы не быў матч, па-ранейшаму для мяне гэта свята, за столькі гадоў праца не стала руцінай.

***— На матчах вы часта працуеце ў дуэце з вядомымі спартсменамі ці трэнерамі. Аднойчы разам з вамі ў эфіры з'явіўся нават Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка...***

— Гэта быў 1998 год, зімовыя Алімпійскія гульні ў Нагана. Прычым такіх матчаў, калі мне ўдалося атрымаць каментарый Аляксандра Рыгоравіча, было нават два. Першы — са зборнай Японіі. На хакейнай арэне ў Нагана каментатарская пазіцыя была не ў асобнай кабіне, а непасрэдна на трыбуне. Вось я заняў сваё месца, а пасля заўважыў, што на трыбунах, на некалькі радоў вышэй за мяне, з'явіўся Прэзідэнт. І я спытаў праз асоб, якія суправаджалі, ці можна запрасіць яго на каментатарскую пазіцыю. Ведаў, што раніцай Аляксандр Рыгоравіч наведаў біятлонную гонку, пасля пабываў на трэніроўцы нашых хакеістаў. Хацелася даведацца яго меркаванне і наконт біятлона, і наконт хакейнага турніру. Меркаваў, хвілін 10—15 удасца паразмаўляць, а атрымалася, што наша размова працягвалася больш за хакейны перыяд.

Другая сустрэча была карацейшай, у канцы той жа Алімпіяды, калі было больш уражанняў ад выступленняў спартсменаў. Я зноў не змог не скарыстаца перавагай прамога эфіру... Безумоўна, хваляваўся. Расійскія калегі пасля казалі: «Валодзя, мы табе зайздросцім: нам з Уладзімірам Уладзіміравічам ніколі не даводзілася весці рэпартаж».

***— Якімі яшчэ гасцямі эфіру ганарыцеся?***

— Раней, калі хакейныя чэмпіянаты свету мы пераважна каментавалі з месца падзей, мне ўдавалася запрасіць у каментатарскую кабіну многіх аўтарытэтных савецкіх і расійскіх трэнераў. Гэта Уладзімір Юрзінаў, Зінэтула Білялетдзінаў, Вячаслаў Быкаў. Вельмі прыемна гэта прыгадваць, бо, калі падыходзіў і казаў, што я каментатар Беларускага тэлебачання, ва ўсіх адказ быў прыкладна аднолькавы: «Вас, беларусаў, усюды любяць і паважаюць, як я магу адмовіць?» Увогуле ж знакамітых суразмоўнікаў было шмат, і ўсіх пералічыць не атрымаецца.

***— Колькі Алімпіяд у вас за плячыма?***

— Сёлетняя ў Пхёнчхане стала ўжо 12-й. Не працаваў я толькі на адной — у 1996 годзе ў Атланце. Адлік пачаўся з 1994-га, калі ўпершыню Беларусь выступіла асобнай камандай на зімовых гульнях у Ліліхамеры. Прычым калі на большасці наступных Алімпіяд у нас была вялікая каманда журналістаў, то ў 1994 годзе былі толькі двое — я і Лена Данільчанка з «Физкультурника Белоруссии». Тады яшчэ мы не закупілі тэлевізійныя правы і не вялі прамыя трансляцыі. Але я разумеў гістарычнасць моманту — гэта былі першыя для суверэннай краіны Алімпійскія гульні. І з відэакамерай, якую даў мне галоўны трэнер нашых веднальыжнікаў Віктар Наважылаў, я паехаў у Ліліхамер. Была невялікая дэлегацыя — каля 30 спартсменаў. І ў кожнага трэнера і спартсмена мы ўзялі інтэрв'ю: я ў ролі аператара, калега Алена — у ролі інтэрв'юера. Здымалі і на трыбунах, і ў горадзе, на вуліцах. Пасля вяртання ў эфір выйшлі тры праграмы «Рэха Алімпіяды» па 40 хвілін. Яны ёсць у фондах Белтэлерадыёкампаніі, і той наш алімпійскі дэбют не застаўся па-за кадрам.



У 1994 годзе, дарэчы, за зборную Беларусі ў фігурным катанні ў спаборніцтвах танцавальных пар выступала знакамітая Таццяна Наўка з партнёрам Самвелам Гезалянам. Я ў зусім юнай тады фігурысткі браў інтэрв'ю. Паколькі ў нас не было тэлевізійных правоў, ой, як мяне ганялі! Наш канькабежац Ігар Жалязоўскі заваёўвае медаль, і мне ж хацелася гэтыя эмоцыі зняць! Дзесьці ўдавалася, дзесьці не.

Зразумела, кожная Алімпіяда — гэта найперш праца. Якой бы шматлікай ні была наша тэлевізійная каманда, нагрузка на ўсіх прыпадае прыстойная. Калі вярнуўся з Нагана ў 1998 годзе, жонка пытае: «Валодзя, ты сушы, сакэ каштаваў? — Света, пра што ты кажаш? Не да таго было».

***— Колькі краін свету аб'ездзілі?***

— Не падлічваў, але нямала. Больш за ўсё шкадую, што не вёў статыстыку, колькі за гэты час было рэпартажаў. Тады думаў, што гэта не важна, у маладыя гады каментатарская кар'ера, ды і жыццё — усё здаецца вечным... Зараз замежных камандзіровак у мяне, дарэчы, няшмат. Вось сёлета была Алімпіяда ў Пхёнчхане — і бадай, усё. На жаль, за гэтыя дзесяцігоддзі я навучыўся працаваць, а адпачываць — не.

***— Чытала ў вашым інтэрв'ю, што адпачынак вы бераце напярэдадні значных спартыўных падзей, каб падрыхтавацца да іх...***

— Так, сёлета быў тры тыдні ў адпачынку ў студзені і рыхтаваўся да Алімпіяды. А сямейны адпачынак — не для мяне. Калі б вярнуць усё назад, магчыма, жыў бы па-іншаму, больш увагі ўдзяляў жонцы, сыну, унучкам...

***— Ваш сын, дарэчы, таксама пайшоў у журналістыку, але выбраў не спартыўную, а іншую сферу. Уплывалі на яго выбар?***

— У тым, што ён выбраў журналістыку, магчыма, і мой уплыў — ён бачыў асаблівасці каментатарскай дзейнасці. Віталь любіў і ведаў спорт, але, калі скончыў журфак, сказаў: не хачу, каб думалі, што я нечага дасягнуў дзякуючы бацькавай падтрымцы. І выбраў свой шлях, працаваў на АНТ, на беларускім радыё, а пасля яго запрасілі ў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Ім ганаруся, мне вельмі прыемна, што прэс-служба МНС на добрым рахунку.

***— Вы, дарэчы, у журналістыку прыйшлі выпадкова, да гэтага скончылі політэхнічны інстытут...***

— У дзяцінстве я быў эрудзіраваным балельшчыкам. Трансляцыі, спартыўныя выданні ўваходзілі ў кола маёй цікавасці, я вёў статыстычныя сшыткі. Але паступіў у політэхнічны інстытут, скончыў энергетычны факультэт, тры гады працаваў інжынерам і зразумеў, што гэта не маё — не ішоў на працу як на свята. У 1981 годзе напісаў пісьмо ў спартыўную рэдакцыю беларускага тэлебачання аб тым, што перадачы можна рабіць больш цікавымі, і распісаў як. На шчасце, маё пісьмо, як твор чарговага графамана, не выкінулі, а запрасілі на гутарку і далі шанц. Пачынаў у якасці няштатнага аўтара радыёчасопіса «Спартыўны арбітр». Адно з першых інтэрв'ю браў тады ў зусім юнага Віталя Шчэрбы. На тэлебачанне прыйшоў на пасаду адміністратара ў рэдакцыю інфармацыі. За пяць дзён паспеў падаць дакументы і вытрымаць экзамен на завочнае аддзяленне журфака, які, дарэчы, скончыў з чырвоным дыпломам. Калі студэнт-завочнік звычайна згодны і на «трояк», то я быў першым студэнтам-завочнікам, які скончыў факультэт на выдатна.

***— Вы маеце званне заслужанага дзеяча культуры. Ці застаецца час на культуру? Тэатр, кіно, кнігі — што ёсць у вашым жыцці?***

— Я вельмі люблю тэатр і кіно. Раней ні адны гастролі маскоўскіх, піцерскіх тэатраў у Мінску не прапускаў, усімі праўдамі і няпраўдамі імкнуўся дастаць білеты. Апошнія гадоў 5-6 я не такі кінаман і тэатрал, як раней. На кнігі, на жаль, — і гэта мой боль — часу застаецца таксама няшмат.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Рыхтуй бочкі летам! Са «Звяздой»!**

**13 ліпеня сярод сваіх падпісчыкаў на трэці квартал або другое паўгоддзе «Звязда» разыграе сем дубовых бочак ёмістасцю 10 літраў і адну (суперпрыз) — ёмістасцю 30!**

**Не забудзьцеся запоўніць купон (*глядзі справа*), выразаць яго і да 11 ліпеня даслаць у рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а. А ўжо далей...**

**Вам пашанцуе!**

*Падрабязныя правілы гульні змешчаны ў нумары за 31 мая. Тэрміны правядзення гульні — з 01.06.2018 да 30.09.2018.*

*Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3284 ад 25.05.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.*



**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2018 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на III квартал або II паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

## Серада, 13 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.10** Зона Х. (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След». (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Чорная кроў». (16+).**
**13.10** Дзіцячы доктар.
**13.40** Дзень у вялікім горадзе.
**14.40, 15.25 Серыял «Ярмолавы». (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.50** Сфера інтарэсаў.
**0.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.45** Тэлебарометр.
**9.05, 19.50 Серыял «Сляпая». (16+).**
**10.10, 17.40 «Што робіць твая жонка?» Серыял. (16+).**
**12.20** «Паненка-сялянка». (16+).
**13.30** «Бітва салонаў». (16+).
**14.30** «Сям'я 3D». Скетчкам. (12+).
**15.05, 22.50** «Анжаліка». Сіткам. (16+).
**16.15, 23.50** Нічога сабе ньюз. (12+).
**16.20, 23.55** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.05** Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).
**21.10** Гандбол. Чэмпіянат свету-2019. Кваліфікацыя. Мужчыны. Плэй-оф. Матч у адказ. Аўстрыя — Беларусь. У перапынку: **21.50** Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Бураковы квас.
**8.05, 12.20, 19.55** Навіны культуры.
**8.20** Гэты дзень.
**8.25, 18.40 «Доктар Жывага». Маст. фільм (16+).**
**9.15, 18.15** «Тайны савецкага кіно». «Тэгеран-43» (12+).
**9.45** «Музеі Беларусі».
**10.10 «Аляксандр Неўскі». Маст. фільм (12+).**
**12.45** «Хата на хату».
**13.35** «Будзіць агонь высокіх мар...» Юбілейны канцэрт паэта-песенніка Івана Цітаўца.
**14.35** «Я хачу гэта ўбачыць!» Траса М4 (6+).
**15.00, 22.15** «Хроніка Перамогі». «Рубяжы. Мажайска-Малаяраславецкая абарончая аперацыя» (12+).
**15.25, 21.05 «Сакрэтны фарватар». Маст. фільм (12+).**
**16.30** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**17.00 «Тры таварышы». Маст. фільм (12+).**
**19.30** «Запіскі на палях». Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.
**20.10** «Беларуская кухня». Кішка.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.40** «Люблю і памятаю». Уладзімір Караткевіч.

### Беларусь 5

**7.05** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Мінск» — «Іслач» (Мінскі р-н).
**8.55** Гульні «навырост».
**9.25** Спорт-кадр.
**9.55** Легенды сусветнага спорту.
**10.25** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Уэльва.
**13.10** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**13.40** Козел пра футбол.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA. Хертагенбош.
**18.05** Слэм-данк.
**18.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — ФК «Гомель». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) — «Дынама» (Мінск). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.40** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Острава.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10 Серыял «Пелагія і белы бульдог» (16+).**
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.25, 13.10** «Гарады-героі. Брэсцкая крэпасць» (12+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Легенды цырка» (6+).
**16.55** «Кантрольная закупка» (12+).
**17.30, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** Вялікі святочны канцэрт (12+).
**23.00** «Рэпарцёр».
**23.20 Серыял «Другі зрок» (16+).**
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.00, 23.50** «Загадкі чалавецтва».
**10.40, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.25** «Аўтапанарама» (12+).
**11.45 Маст. фільм «Немагчымыя зялёныя вочы». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**13.50, 20.15 «Белыя ваўкі-2». Серыял (16+).**
**15.35** «Ежа багоў» (16+).
**16.50** «Самая карысная праграма» (16+).
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.55, 0.40 «Турысты». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**21.55** «Глядзець усім!» (16+).

### МІР

**6.05, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Метад Фрэйда». (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
Вось і Юльян Ігнатовіч з вёскі Пачобуты адзін даглядае сваю пярэстую кароўку. Сам доіць, па магчымасці нарыхтоўвае сена, хоць яму ідзе 83-і год. Жвавага дзядулю мы знайшлі на агародзе, дзе ён акучваў бульбу. Побач акуратныя радкі цыбулі, морквы і іншай гароднiны. Паводдаль — вуллі з пчоламі. Юльян Антонавіч больш за 20 гадоў жыве адзін, але па-ранейшаму вядзе гаспадарку. Кажа, што некалі зарабляў на вырошчванні агуркоў, тут была сапраўдная агурочная сталіца. За гэтыя сродкі купіў сынам кватэры ў Гродне, пачаў будаваць новы дом у вёсцы. Але паступова агурочны цэнтр змясціўся ў іншы рэгіён, а інфляцыя «з'ела» ўсе зберажэнні. Зараз асноўны прыбытак у пенсіянера — гэта малако. Кожны дзень ён мае да 20 літраў, кошт 1 літра — 54 капейкі. Такім чынам за дзень можна зарабіць больш за 10 рублёў. Па выніках месяца ёсць надбаўкі.



Юрый АЎДЗЕЙ са старшынёй Канюхоўскага сельскага Савета Віталем РУДКІНЫМ.

Стараста вёскі Ігнатовічы Часлава Вансовіч за 10 дзён зарабіла 140 рублёў з адной каровы. Яна здае амаль усё малако, некалькі літраў купляюць мясцовыя жыхары. Жанчына сцвярджае, што заробак даволі істотны. Праўда, каровы патрабуюць догляду, а каб было больш малака, іх трэба добра паіць. Напрыклад, зімой карова спажывае да 80 літраў вады ў дзень. У гаспадарцы ёсць парасяты, куры, трусы.

— У нас вельмі працавітыя вяскоўцы, — адзначае Віталь Рудкін, — усе, хто тут застаўся, хто тут пастаянна пражывае, маюць гаспадарку. Некаторыя трымаюць коз, авечак. Мясцовае сельгаспрадпрыемства дапамагае і кармамі, і зернем. Малочны статак пакуль стабільны, а сёлета нават прыбавіўся адзін новы здатчык. Людзі бачаць, наколькі гэта выгадная справа.



Самы сталы здатчык — 82-гадовы Юльян ІГНАТОВІЧ.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

А ЯК У ВАС?

# МАЛАКАЗДАТЧЫК, БУДЗЬ СУМЛЕННЫМ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

**У раёнах паступова адыходзяць ад практыкі закупу малака ў насельніцтва сельгаспрадпрыемствамі.**

## Дакладна па графіку

Усіх малаказдатчыкаў **Камянецкага раёна** ўжо некалькі гадоў абслугоўвае прыватнае прадпрыемства «БУШсэрвіс». А цяпер у зону абслугоўвання названага прадпрымальніка ўвайшло яшчэ некалькі сельсаветаў Брэсцкага і Жабінкаўскага раёна. Калектыў «БУШсэрвіс» налічвае зараз 13 чалавек.

Яго **дырэктар Анатоль ШВЕЙКУС** раней працаваў у штаце высокаўскага завода «Белавежскія сыры», па родзе работы — з малаказдатчыкамі. А потым не без падачы кіраўніцтва рашыў заняцца справай прафесійна. Так нарадзілася прыватнае прадпрыемства. Правільней сказаць, ідэя, якая атрымала матэрыяльнае ўвасабленне пасля пакупкі спецыялізаваных аўтамабіляў і найму кіроўцаў. Быў час, калі тут працавалі 12 шафёраў. Потым прайшла аптымізацыя, усе затраты старанна падлічылі, графікі скарэктавалі. Да таго ж тэхніка абнаўляецца, новыя машыны сталі больш эфектыўнымі.

— Зараз у нас працуе восем кіроўцаў, — расказвае Анатоль Швейкус. — Штодня на лінію выходзіць шэсць машын, двое шафёраў на выхадных. Нарыхтоўшчыкі збіраюць малако ў 144 вёсках. Значыць, у сярэднім на аднаго кіроўцу прыходзіцца 24 населеныя пункты, куды трэба заехаць, забраць малако ў гаспадароў, потым завезці ў нашу лабараторыю, пасля гэтага даставіць на завод.

Машыны «БУШсэрвіса» працуюць, нібы маршрутнае таксі, строга па графіку.

— Пяць хвілін прамаруджвання лічыцца ў нас недапушчальным, асабліва на першым маршруце. Час другога і трэцяга выездаў кіроўцы можа быць скарэктаваны лабараторыяй альбо непасрэдна заводам, што залежыць не ад нас. Тады малаказборшчык выбіваецца з графіка, але людзі папярэджаныя, яны ведаюць, што трэба трохі пачакаць. У любым выпадку 460 малаказдатчыкаў з трох раёнаў абслугоўваем кожны дзень.

У свой час Анатоль Швейкус ездзіў вучыцца ў Еўропу. І работу ўласнага прадпрыемства імкнуўся выбудаваць дакладна і рацыянальна. На жаль, гаварыць пра стапрацэнтную скрупулёзнасць і сумленнасць сельскіх гаспадароў пакуль не даводзіцца, таму кантроль якасці малака становіцца адным з асноўных этапаў работы. У прадпрыемства ёсць тры свае лабараторыі: у Высокім, Чэрнях і Відамлі. Спачатку кіроўцы дастаўляюць малако ў найбліжэйшую лабараторыю, дзе спецыяліст робіць аналіз. Калі якасць выклікае нараканні, сыравіна вяртаецца гаспадарам. Добрае малако дастаўляецца на завод, дзе яго правярае заводская лабараторыя.

*(Заканчэнне на 14-й стар. «МС».)*

# МАЛАКАЗДАТЧЫК, БУДЗЬ СУМЛЕННЫМ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 13-й стар.)*

Дарэчы, цяпер «БУШсэрвіс» вязе прадукт не толькі ў Высокае на «Белавежскія сыры», але і ў Брэст на «Савушкін прадукт». Бывалі, на жаль, выпадкі, калі цэлы малакавоз заварочвае заводская лабараторыя. «На заводах стаіць абсталяванне па праверцы на антыбіётыкі коштам у 50—60 тысяч еўра, — тлумачыць Анатоль Швейкус. — У нас прыборы куды больш сціплыя. Ну і «праскокваюць» асобныя віды антыбіётыкаў. А такое малако вытворцам не патрэбнае. Вось і вяртаюць». Для нарыхтоўшчыкаў гэта абарочваецца зрывам графіка і фінансавымі стратамі.

Што яшчэ адзначае Анатоль Міхайлавіч як станоўчы момант сваёй работы — гэта супрацоўніцтва з сельскімі Саветамі. Паводле яго слоў, без мясцовай улады арганізаваць працэс было б наогул немагчыма. Жыццё ёсць жыццё. І ледзь не штодзень узнікаюць калі не канфліктныя, дык спрэчныя сітуацыі, якія дапамагаюць разрульваць менавіта старшыні сельвыканкамаў.

— Калі выяўляецца наша недапрацоўка, мы стараемся выправіць памылку адразу ж. А калі чалавек прывык разбаўляць малако вадой, а потым скардзіцца, што яго сыравіну няправільна ўлічваюць, тут трэба яму ўказаць на недапушчальнасць паводзінаў, — расказвае дырэктар прыватнага прадпрыемства. — Так што супрацоўніцтва з мясцовай уладай нам неабходна.

## Эксперымент атрымаўся

У **Маларыцкім раёне** традыцыйна зборам малака займаюцца сельгаспрадпрыемствы. **Старшыня раённага Савета дэпутатаў Алег ЯКУБЧЫК** адзначае, што не заўсёды справа ідзе гладка. Узнікае шмат пытанняў у насельніцтва, заводы нямала сыравіны вяртаюць па прычыне недастаткова высокай якасці. Такім чынам страты церпяць і сельгаспрадпрыемствы, і малаздатчыкі. Таму сёлета ў якасці эксперымента рашылі запрасіць у адзін з сельсаветаў малаказборшчыка з суседняга Кобрынскага раёна. Кобрынскае прадпрыемства па зборы малака «Івалга» цяпер забірае яго ад насельніцтва ў Чарнянах, якія размешчаны на мяжы двух раёнаў.

**Старшыня Чарнянскага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр ПЯТРУЧЫК** гаворыць:

— Хоць прайшоў усяго месяц, можна смела сцвярджаць, што эксперымент удаўся. Раней былі бясконцыя скаргі вясковых жыхароў, што прадпрыемства «Савушкін прадукт» вяртае малако, прад'яўляючы неабгрунтаваныя прэтэнзіі. І як тут разабрацца мясцовай уладзе, ці сапраўды ёсць праблемы з якасцю або падыход спецыялістаў занадта строгі? А цяпер, калі малако з нашай вёскі вязуць на Кобрынскі малочны завод, за месяц не было ніводнага выпадку, каб прадукцыю вярнулі. І людзі адрэагавалі вельмі хутка. Напрыклад, адзін гаспадар, які збіраўся прадаць карову, перадумаў гэта рабіць, а іншы нават купіў сабе другую. Бо, жывучы ў вёсцы, малако здаваць выгадна, гэта жывая капейка ў сямейны бюджэт.

Дарэчы, прадпрыемства «Івалга» — гэта былы КУП. Такія амаль два дзясяткі гадоў таму арганізоўвалі ледзь не пры кожным сельвыканкаме. Потым яны па прычыне нерэнтабельнасці адзін за другім спынялі сваё існаванне. А ў Кобрыне адзін КУП выжыў, яго своечасова пераўтварылі ў прадпрыемства па зборы малака. **Дырэктар Сяргей КРЫШТАЛЮК** расказаў, што ў сваім раёне яны аб'язджаюць за дзень прыкладна 40 населеных пунктаў. Цяпер вось узялі пад крыло і маларыцкіх Чарняны. «Івалга» не мае свайго аўтатранспарту, затое мае 13 падвод, на якіх штатныя малаказборшчыкі аб'язджаюць гаспадароў і збіраюць сыравіну кожную раніцу. На цэнтральных сядзібах гаспадарак ёсць халадзільныя ўстаноўкі для ахалоджвання прадукцыі, таксама ёсць лабаранты.

Скажам, у Чарнянах у восем раніцы малако сабралі, прывезлі ў цэнтр, спецыяліст праверыў якасць, за гадзіну малако астыла, а ў дзевяць прыязджае малакавоз. Усе машыны, якія адвозяць прадукцыю на Кобрынскі завод, заводскія. Іх маршрут адладжаны па часе.

«Івалга» прапаноўвала забіраць лішкі малака і ў суседніх Дарапеевічах, але людзі аказаліся не гатовыя здаваць. Там два гады малако не збіралі, таму гаспадары прызвычаіліся прадаваць яго суседзям, дачнікам, адвозіць у горад ці рэалізоўваць нейкім іншым чынам. Тут патрэбны час, каб зноў знайшліся ахвотныя здаваць лішкі прадукцыі, як раней.

Яшчэ адну важную дэталь адзначыў Сяргей Крышталюк. Паводле яго ацэнкі, усе малаказдатчыкі ў Чарнянах надзвычай адказныя і сумленныя гаспадары, таму і не было ніводнага вяртання прадукцыі з завода. «І нам добра, і ім выгадна, — расказвае Сяргей Уладзіміравіч. — А то ў нас нядаўна ў адной з вёсак знайшоўся аматар падліць вады, мы яго так і не вылічылі, а страты панеслі ўсе яго аднавяскоўцы (паколькі малако зліваецца ў агульную ёмістасць), і наша прадпрыемства. Акрамя таго, былі непрыемныя разборы. У нашай справе важны давер, які грунтуецца на сумленнасці кожнага».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі, Маларыцкі раёны.*


**Извещение о проведении 29 июня 2018 года торгов по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе, инв. номер в ЕГРНИ)** | Изолированное помещение (ремонтно-механический цех) с инвентарным номером 622/D-31489. Общая площадь – 1 124,1 кв. м. Назначение – производственное помещение. Год постройки – 1954. Ремонтно-механический цех расположен на первом, втором и подвальном этажах здания. Наружные и внутренние стены, перегородки – кирпичные. Полы – бетонные. Дверные и оконные проемы – деревянные. Перекрытия – плиты ж/б. Внутренняя отделка – оштукатурено. Отопление – центральное. Канализация – автономная. Горячее и холодное водоснабжение – централизованная система. Электроснабжение – централизованная система. Вентиляция – с естественным побуждением. Имеется душ |
| **Местонахождение имущества** | Минская обл., Столбцовский р-н, Новоколосовский с/с, п. Новоколосово, ул. Победы, 10Б/42-1 |
| **Продавец имущества** | Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных сил», ул. Димитрова, 42, 225320, г. Барановичи |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 81 787,66 бел. руб. |
| Сумма задатка | 8 000,00 бел. руб. |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, заключившие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов (утвержденной формы), внесшие задаток по соответствующему предмету торгов, подавшие организатору торгов заявление на участие в аукционе (утвержденной формы), к которому прилагаются:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе (назначение платежа – задаток для участия в аукционе от 29.06.2018).

Торги проводит аукционист, определяемый организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с Положением.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель аукциона (единственный участник торгов) в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под подпись.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона (единственным участником торгов) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **29 июня 2018 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов на участие в аукционе, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.06.2018 по 27.06.2018 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (8029) 936-76-36, (8029) 528-85-82, (0163) 41-26-78 (государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных сил»).



**РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 11.07.2018 г. открытого аукциона по продаже недвижимого имущества**

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-63764 общей площадью – 1077,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Академика Павлова, 48; назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – производственное здание лесопильного цеха. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000003004266. **Начальная цена продажи – 44 370,00 рублей, задаток – 4 437,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-43359 общей площадью – 378,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Академика Павлова, 48; назначение – медпункт, наименование – медпункт. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000003004280. **Начальная цена продажи – 34 020,00 рублей, задаток – 3 402,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-63848 общей площадью – 2583,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Академика Павлова, 48; назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – производственное здание «Обойный цех». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000003004279. **Начальная цена продажи – 207 450,00 рублей, задаток – 20 745,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-63844 общей площадью – 6210,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Академика Павлова, 48; назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – производственное здание цеха № 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000003004265. **Начальная цена продажи – 244 305,00 рублей, задаток – 24 430,50 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-26929 общей площадью – 2521,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, пер. Новый 1-й, 1; назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание производственного корпуса. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006412. **Начальная цена продажи – 311 040,00 рублей, задаток – 31 104,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-26923 общей площадью – 1034,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, пер. Новый 1-й, 1; назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание специализированное иного назначения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006412. **Начальная цена продажи – 133 920,00 рублей, задаток – 13 392,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-26921 общей площадью – 1210,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, пер. Новый 1-й, 1; назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006412. **Начальная цена продажи – 285 120,00 рублей, задаток – 28 512,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-26928, общей площадью – 9,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, пер. Новый 1-й, 1; назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006412. **Начальная цена продажи – 3 672,00 рублей, задаток – 367,20 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-76364 общей площадью – 801,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Молодечненский район, Тюрлевский с/с, д. Насилово, ул. Школьная, 30/1; назначение – здание специализированное транспорта, наименование – гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623884308601000407. **Начальная цена продажи – 98 280,00 рублей, задаток – 9 828,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Капитальное строение с инвентарным номером 331/С-7040 общей площадью – 279,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская область, г. Ельск, тракт Кочищанский, 3/6, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание гаража (навеса), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321450100003000204. **Начальная цена продажи – 32 508,00 рублей, задаток – 3 250,80 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-70773768 общей площадью 43,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Щорса, 3-1Н, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение (помещение товарищества собственников). **Начальная цена продажи – 82 296,00 рублей, задаток – 8 229,60 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, не позднее 3 рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счет-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ.

**Аукцион состоится 11.07.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

1. Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001 ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк» 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77 , ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот № ___, проводимом 11 июля 2018 г.

2. Заявление на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Уручская, 14а, Управление по реализации недвижимости в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений 06.07.2018 в 14.00.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01, +375 17 380 27 37, +375 44 763 62 63, +375 29 551 06 05, +375 29 660 43 51**

МАЛЫЯ ГАРАДЫ

# «ПАД КРЫЛОМ» ГОРАДАЎТВАРАЛЬНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА

**Калі дэпутат і твой начальнік на працы — адзін і той жа чалавек, ці дапамагае гэта хутчэй вырашаць пытанні жыццезабеспячэння?**

**ТУТ заўсёды было такое раздарожжа. Напачатку — мяжа паміж савецкімі і польскімі тэрыторыямі, потым — месца, дзе «злучаліся» Брэсцкая, Мінская і Гомельская вобласці. Аднак сённяшнім статусам горад Мікашэвічы абавязаны гранітнаму кар'еру, на якім пабудавана адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў па здабычы каменю.**



Вулічны трэнажорны комплекс побач з Палацам культуры. Вечарам тут займаюцца дарослыя, днём — гуляюць дзеці.

## На каменнай «падушцы»

Калі прыглядзецца да гісторыі гэтай мясціны, стане зразумела, што яе стваралі рабочыя. Упершыню Мікашэвічы — тады яшчэ вёсачка на пару дамоў — згадваюцца ў 1875 годзе. Штуршком да развіцця і росту паслужыла будаўніцтва чыгункі. Яшчэ адну прыступку пасёлак адолеў, калі тут запрацаваў фанерны завод. Да 1939 года пры польскіх гаспадарах на ім выраблялі прадукцыю, якая карысталася попытам за мяжой, напрыклад матэрыялы для тагачасных паветраных апаратаў.

Самай значнай і лёсавырашальнай для горада падзеяй стала выяўленне побач залежаў гранітнага каменю. Фактычна ўсё тут пабудавана на каменнай «падушцы», пра якую геолагі-даследчыкі загаварылі яшчэ ў 60-я гады, але з-за марудная распрацоўкі дакументацыі здабыча пачалася толькі праз 15 гадоў.



На тэрыторыі санаторыя «Світанак», падведамаснай арганізацыі прадпрыемства, таксама праводзяцца ўрачыстасці, напрыклад рэгістрацыя шлюбу.

Цяпер з больш чым 12 тысяч жыхароў каля 2,5 тысячы працуюць на прадпрыемстве «Граніт».

— Напачатку прыязджалі рабочыя, каб будаваць завод, потым — каб працаваць на ім. Першыя перасяленцы з'язджаліся з усяго Савецкага Саюза. Напэўна, адсюль і асаблівае стаўленне жыхароў адзін да аднаго, — лічыць **старшыня Мікашэвіцкага гарадскога выканаўчага камітэта Галіна СЫЦЭВІЧ.** — Людзі будаваліся ўсім мірам, жылі побач. Не дзіва, што адбыўся сімбіёз культур. Напрыклад, калі тут ішло будаўніцтва жылля, жыхары не проста чакалі, калі ім выдзеляць кватэру, а пасля працы ішлі дапамагаць будаўнікам, агулам высаджвалі алеі, стваралі кветнікі...

## А давайце патанцуем!

Падпарадкаваны Лунінецкаму раёну горад мае жорстка распланаваны бюджэт. Аднак частка работ тут выконваецца за кошт спонсарскай дапамогі — завод выдзяляе гарадскім службам тэхніку і прадукцыю, той жа шчэбень для падсыпкі дарог, а таксама грашовыя сродкі. Такім чынам гарадскія ўлады атрымліваюць дадатковае фінансаванне на азеляненне, добраўпарадкаванне вуліц, пракладку тратуарнай пліткі і агульнага добраўпарадкавання.

Цікава, што прадпрыемства фактычна адказвае і за ўвесь культурны адпачынак жыхароў. Палац культуры ў Мікашэвічах пабудаваны за кошт «Граніта» і, па сутнасці, падпарадкоўваецца прадпрыемству. Плошча перад Палацам культуры — гэта цэнтр горада. Прадпрыемства запланавала на гэты год работы па навядзенні тут прыгажосці. Калі ўсё атрымаецца, на плошчы паставяць адкрытую сцэну, фантан і арганізуюць зону адпачынку. Дарэчы, з другога боку будынка знаходзіцца вулічны трэнажорны комплекс, які жыхары таксама атрымалі ў падарунак ад прадпрыемства.

— Калі памятаць, што больш за дзве тысячы чалавек працуюць на «Граніце», атрымліваем значную частку гарадского насельніцтва. Мы разлічвалі, што жонкі, дзеці, бацькі нашых работнікаў змогуць бавіць тут час — адпачываць, трэніравацца, — каментуе **намеснік генеральнага дырэктара РУВП «Граніт» Маргарыта СЕРАВОКАЯ.**

Прадпрыемства мае восем творчых самадзейных калектываў, а гараджане могуць удзельнічаць у танцавальных, вакальных і тэатральных гуртах, якія створаны на базе Палаца культуры.

— У маім гурце займаецца 90 дзяцей узростам ад пяці да чатырнаццаці гадоў, — расказвае **Наталля ТУМАКОВА, кіраўнік узорнага калектыву эстрадна-спартыўнага танца «Эдэльвейс».** — Уплыў прадпрыемства на дзейнасць гуртоў адчувальны. Як прыклад — харэаграфічны клас, дзе мы з вамі цяпер знаходзімся. Гады тры таму тут усталявалі люстэркі да падлогі, балетныя станкі, кандыцыянеры. Калі дзеці выязджаюць куды-небудзь з канцэртам, транспарт зноў жа аплачвае прадпрыемства.

Акрамя гарадскіх і раённых свят, творчыя калектывы ўдзельнічаюць у міжнародных, рэспубліканскіх конкурсах. У якасці падзякі за прызавыя месцы для дзяцей арганізоўваюць бясплатныя ранішнікі, святы, дыскатэкі. Дарослыя артысты і кіраўнікі гуртоў атрымліваюць матэрыяльнае заахвочванне. Жыхары горада, як заўважае **кіраўнік творчага калектыву MikaDance Іван НЯМЧЭНЯ,** «лёгкія на прапанову». Напрыклад, сам маладзёжны калектыў MikaDance узнік з кінутага аднойчы жарту. Маладыя бацькі прыводзілі дзяцей на танцавальныя занятки і чакалі малых тут жа, у калідоры. І аднойчы нехта напаўсур'ёзна прапанаваў: «А давайце патанцуем у суседнім класе?»

## І наймальнік, і дэпутат

Буйное прадпрыемства ў многім вызначае лёс невялікага горада. Так, некаторыя прадстаўнікі кіраўнічага звяна абраны дэпутатамі мясцовага Савета. Генеральны дырэктар РУВП «Граніт» Эдуард Гаўрылковіч наогул з'яўляецца «тройчы дэпутатам» — гарадскога, раённага і абласнога Саветаў.

Гэта дазваляе аказваць дапамогу не толькі аб'ектам прадпрыемства, але і тэрыторыі горада, бліжнім населеным пунктам. Раз на месяц кіраўнік прадпрыемства праводзіць прыём па асабістых пытаннях як наймальнік і адначасова як дэпутат. Сёлета, напрыклад, па просьбе жыхароў была ўстаноўлена сотня лавачак і смеццяцы каля дамоў, а дзіцячы садок у вёсцы Сінкевічы атрымаў дзякуючы прадпрыемству гульнявы комплекс. Завод забяспечвае жыхароў рабочымі месцамі, сярод супрацоўнікаў шмат сямейных дынастый. Мясцовая моладзь часта вяртаецца пасля вучобы на радзіму, і таму колькасць прыезджых спецыялістаў, наадварот, невялікая. Як правіла, арэнднае жыллё часта патрабуецца для маладых медыкаў, служачых РАНС, РАУС. У калектыўным дагаворы прапісаны шэраг сацыяльных ільгот для работнікаў...

Як відаць, развіццё горада ў многім залежыць ад дабрабыту прадпрыемства. Так што, акрамя пераваг, існуе таксама вялікая адказнасць, бо ад ініцыятывы і кампетэнтнасці кіраўнікоў-дэпутатаў, іх умення слухаць сваіх выбаршчыкаў-падначаленых залежыць камфортнасць жыцця гараджан.

* * *

*Ужо падрыхтаваўшы матэрыял да друку, падумала: паміж сельскімі, раённымі і гарадскімі Саветамі дэпутатаў, якімі б рознымі яны ні былі, усё ж можна адсачыць падабенства: часцей за ўсё грамадскі абавязак дэпутата нясе на сабе чалавек, які займае кіраўнічую пасаду. З аднаго боку, сітуацыя цалкам заканамерная. Такі народны абраннік ужо мае вопыт арганізацыі працы, умее пралічваць бюджэт, складаць планы развіцця і гэтак далей. І ўсё ж такі падаецца, што работа мясцовых Саветаў была б яшчэ больш эфектыўнай, калі б у ёй шырэй прымалі ўдзел прадстаўнікі шырокараспаўсюджаных пасад і прафесій: настаўнікі, урачы, бібліятэкары, будаўнікі, электрыкі... Такім чынам, навыкі кіраўнікоў маглі б спалучацца з «нізавой» ініцыятывай грамадзян, якія бачаць праблему не «зверху», а «знутры».*

*Нарэшце, існуе далікатны момант, калі падчас канфлікту з начальнікам на працы чалавек не можа звярнуцца па дапамогу да народнага абранніка, бо кіраўнік і дэпутат — гэта адна асоба. У выпадку, калі б мясцовы Савет складаўся са спецыялістаў розных узроўняў, то і на канфліктную сітуацыю яны глядзелі б па-рознаму.*

*У кожнай мясцовасці свая спецыфіка, а ў кожнага чалавека — сваё меркаванне. Цікава, а што думаеце наконт гэтага вы, паважаныя чытачы?*

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**



Месца адпачынку ў цэнтры горада.

# СЫРНАЕ СВЯТА Ў ЛЮБЧЫ

**«Падаіць» цацачную карову, выпіць на хуткасць шклянку сапраўднага малака, пакаштаваць хатні сыр ці сырны пірог маглі ў нядзелю госці смачнага свята — «Любчанскі сыравар».**

Галоўныя героі незвычайнага відовішча Малочніца і яе рагуля Пеначка расказвалі пра каштоўныя ўласцівасці малочных прадуктаў, дзяліліся кулінарнымі сакрэтамі і частавалі прысутных сырнымі прысмакамі.

Гарадскі пасёлак Любча, што ў Навагрудскім раёне, ператварыўся ў той дзень у сапраўдную сырную краіну. Гледачы ўбачылі шоу «Усе смакі свету — у кавалку сыру», паўдзельнічалі ў конкурсе «Сырныя дасягненні» і даведаліся «Усё пра сыр» на тэматычнай кніжнай выстаўцы. Напрыклад, аб тым, што першы сыр больш за 7000 гадоў таму зрабілі старажытныя егіпцяне. А мяркуючы па колькасці ахвотных пакаштаваць і набыць прапанаваныя стравы, сваю актуальнасць сыр не страціў і дагэтуль.

**Ірына СІДАРОК.**

ТЭХНАЛОГІІ

# У МЕТРО — ПА КАРТКАХ

**Да канца чэрвеня турнікеты бескантактавай аплаты з'явяцца на ўсіх станцыях метро.**

Ужо цяпер турнікеты з бескантактавай аплатай прадстаўлены ў вестыбюлях станцый метро «Плошча Леніна», «Каменная Горка» і «Плошча Якуба Коласа». Па даных БПС-Ашчадбанка, імі ўжо скарысталася больш за 50 тысяч пасажыраў. Мяркуецца, што ў чэрвені такая магчымасць будзе рэалізавана на ўсіх станцыях сталічнай падземкі.

Разлічвацца за праезд без жэтонаў і праязных зараз могуць уладальнікі картак Visa payWave і MasterCard PayPass. Неўзабаве БПС-Ашчадбанк забяспечыць такую магчымасць трымальнікам бескантактавых картак нацыянальнай плацежнай сістэмы.

Для аплаты праезду трэба прыкласці картку да валідатара на паверхні турнікета. З «пластыку» аўтаматычна спішацца 65 капеек, што раўназначна кошту жэтона, пасля чаго можна свабодна ісці на платформу. Аплата займае ўсяго 0,3 секунды.

Праект рэалізуецца банкам разам з Мінскім метрапалітэнам, плацежнымі сістэмамі Visa і MasterCard і кампаніяй IBA Group.

**Сяргей КУРКАЧ.**

БЕЛАРУСЬ ТУРЫСТЫЧНАЯ

# У ГОСЦІ ДА ПРЫРОДЫ

## Што шукаюць іншаземцы на Палессі?

**Іспанцы, брытанцы, венгры, немцы, французы, бельгійцы — далёка не поўны спіс бёрдвотчараў (арнітолагаў-аматараў), якія гэтай вясной прыязджалі ў Жыткавіцкі раён. Прыцягвае іх беларускі поўдзень нездарма: падчас міграцыі тут збіраецца неймаверная колькасць розных відаў птушак. Некаторыя аматары займаюцца фотапаляваннем, іншыя простаназіраюць за жывой прыродай у бінокль ці трубу.**

— Акрамя кулікоў, асаблівай папулярнасцю карыстаецца белая сініца. Каля Турава яе знайсці не праблема, — расказвае **старшыня Жыткавіцкага раённага аддзялення «Аховы птушак Бацькаўшчыны» Настасся БЛОЦКАЯ.** — Летась менавіта тут упершыню ў Беларусі гняздзіліся шыладзюбка і хадулачнік. Сёлета таксама некалькі пар ужо бачылі на гнёздах. Тураўскі луг з'яўляецца заказнікам і важным месцам для айчыннай арніталогіі. Па прыкладных падліках Настассі Блоцкай, у Тураў з красавіка па чэрвень прыязджае каля тысячы турыстаў.

У горадзе ёсць некалькі гасцініц, але інфраструктуры не хапае. Што датычыцца харчавання, хацелася б разнастайнасці. Так, у адным і, як падаецца, найбольш папулярным мясцовым кафэ, некаторы час таму пачалі прапаноўваць не толькі піцу, але і сушы. Аднак з уласнага вопыту ведаю: не заўсёды стравы, прапанаваныя ў меню, ёсць у наяўнасці. Пры гэтым пажадана, каб выбар быў і для вегетарыянцаў. Хоць раён і знаходзіцца на поўдні, ёсць пэўная праблема з садавінай. Калі ў сталіцы замежныя госці могуць набыць бананы ў кожнай краме, то ў Жыткавічах іх прыйдзецца яшчэ пашукаць. Пры тым што для некаторых садавіна і агародніна — асноўныя элементы харчавання.


Так праходзіла свята кулікоў у 2016-м.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што можна было б прапанаваць яшчэ? На думку Настассі Блоцкай, было б цікава, каб у Жыткавіцкім раёне распрацавалі брашуры з маршрутамі. У такіх даведніках для турыстаў на розных мовах можна, напрыклад, пазначыць, у якіх месцах знаходзяцца тыя ці іншыя птушкі — і людзям будзе зручней вандраваць па краі. Акрамя таго, там, дзе птушкі гняздуюцца, не хапае пэўных стэндаў, якія пра гэта папярэдзілі б. Турысты прыязджаюць і часам не ведаюць, што, паставіўшы тут палатку, яны спудзяць птушак. А без дogляду бацькоў маленькія птушаняты ўжо ніколі не вылупяцца.

Да таго ж зараз неабходна адрамантаваць спецыяльную вышку для бёрдвотчараў — дапамогу знайшлі на адным з прадпрыемстваў. Таксама плануюць знайсці партнёраў, каб ачысціць Тураўскі луг — падобныя акцыі штогод праводзяць сіламі валанцёраў.

Візітнай карткай горада яшчэ не так даўно было Свята кулікоў, якое, на жаль, ужо два гады не праводзіцца. Пры тым што самі мясцовыя ўлады ў ім зацікаўлены, знайсці фінансаванне не так проста. **Дырэктар Тураўскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Алена ПАКЛОНСКАЯ** спадзяецца, што ў наступным годзе на пачатку мая Тураў зноў збярэ птушыных аматараў.

Знайшліся і спонсары з Вялікабрытаніі, зацікаўленыя ў захаванні біяразнастайнасці і ахове прыроды, — поймення лугі з такой колькасцю птушак для іх вельмі важныя. Дарэчы, маладыя людзі з замежных краін часта ездзяць сюды індывідуальна: наведваюць аўтэнтычныя вёскі, цікавяцца фальклорам. Для іх нязвыклыя нашы архітэктурныя формы, тыя мясціны, дзе захавалася самабытнасць. Таму ёсць сэнс развіваць і такі напрамак.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ВОЙТ ЦІ ВАЯВОДА?

## або Як продкі дзялілі ўладу

**Мы працягваем цыкл публікацый, прысвечаных гісторыі мясцовага самакіравання. Сёння наш пастаянны эксперт, старшы навуковы супрацоўнік навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік» Максім МАКАРАЎ раскажа пра тое, як у Віцебску ў XVIII стагоддзі раптам узнікла цікавасць да вывучэння гісторыі і як тут змагаліся за мясцовую ўладу.**

### ПРАДАЎ ПАСАДУ?

— Чаму ў Віцебску цікавасць да гісторыі з'явілася менавіта ў XVIII стагоддзі? Тады стварылі шэраг дакументаў, якія даюць нам магчымасць казаць пра гэта. Пісалі, безумоўна, і раней. Але гэта ў пераважнай большасці жыццёвыя нататкі. Упершыню ж жыхар горада Стэфан Гаўрылавіч Аверка паставіў перад сабой задачу напісаць усёабдымную гісторыю Віцебска. Так з'явіўся твор, які пры ўсёй яго недасканаласці, прэтэндуе быць першай агульнагарадской гісторыяй, — разважае эксперт.

Ён сцвярджае, што цікавасць да старых дакументаў і гісторыі была распаленая падчас барацьбы за войтаўства — уладу над горадам.

17 сакавіка 1597 года кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Ваза надаў Віцебску Магдэбургскае права. Горад стаў самастойнай адміністрацыйнай адзінкай, без навакольных зямель (цяпер бы сказалі — тэрыторыі раёна). Насельніцтва вызвалілі з-пад непасрэднай улады мясцовага ваяводы і падпарадкавалі войту — асабліваму велікакняжацкаму намесніку. Гэтая пасада была вельмі даходнай. Зразумела, што менавіта ў горадзе канцэнтравалася найбольш эканамічна актыўная і плацежаздольная частка насельніцтва павета.

— Аднак самастойнае і не падкантрольнае нікому, акрамя манарха, войтаўства праіснавала ў Віцебску нядоўга. У лютым 1603 года войт (а па сумяшчальніцтве каралеўскі сакратар і стараста веліжскі) Аляксандр Корвін-Гансеўскі пасля заключэння адпаведнага дагавора, хутчэй за ўсё, прадаў пасаду віцебскага ваяводы Яну Завішу, — мяркуе Максім Макараў.

### КАМІСАРСКІ СУД... XVII СТАГОДДЗЯ

Праз амаль шэсць гадоў пасля падаравання Віцебску Магдэбургскага права войтаўства апынулася ў руках галавы лакальнай земскай адміністрацыі і стала пераходзіць ад аднаго ваяводы да наступнага.

— Цікава, што гэта было дастаткова спакойна ўспрынята мяшчанскай абшчынай. У XVI—XVII стагоддзях сітуацыя, калі ў гарадах з Магдэбургскім правам велікакняжацкія земскія намеснікі выконвалі першасныя функцыі войтаў на падставе «асабістай уніі» пасад, была досыць тыповай для паўночных памежных рэгіёнаў ВКЛ. У прыватнасці, так было ў Полацку, Дзісне, Оршы, — канстатуе суразмоўнік.

Пасля забойства 12 лістапада 1623 года віцебскімі праваслаўнымі мяшчанамі полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча ў адпаведнасці з распараджэннем караля Жыгімонта Вазы і дэкрэтам камісарскага суда горад пазбавілі ўсіх правоў. У тым ліку Магдэбургскага.

Але, нягледзячы на гэта, войтаўства горада (а войтам быў Мікалай Завіша, сын ваяводы) захавалася. Дзеянне Магдэбургскага права ў Віцебску было адноўлена толькі восенню 1641 года.

28 верасня, пры паўторным дараванні Віцебску гэтага права, кароль польскі і вялікі князь літоўскі Уладзіслаў IV Ваза пакінуў пажыццёва войтаўства пры вяльможным Крыштафе Кішцы, ваяводзе віцебскім.

У той жа час каралеўскім прывілеем прадугледжвалася, што пасля яго смерці парадак прызначэння войта будзе зменены. Калі дакладней, то мяшчане змогуць выбіраць чатырох кандыдатаў шляхецкага паходжання, каб прадставіць іх каралю. А манарх ужо аддасць перавагу аднаму і зацвердзіць яго на пасадзе войта.

Аднак, пасля смерці ў 1646 годзе Крыштафа Кішкі мяшчане не скарысталіся дадзеным правам. І войтам стаў новы ваявода віцебскі Павел Сапега. У другой палове XVII — пачатку XVIII стагоддзя войтаўства заўсёды даставалася чарговаму мясцоваму ваяводзе. І традыцыйна паступова стала ўспрымацца як прыдатак да пасады кіраўніка лакальнай земскай адміністрацыі. Аж да 1772 года войт (практычна заўсёды ў асобе ваяводы) заставаўся адзінай рэальна значнай фігурай у сістэме гарадскіх улад Віцебска.

### ХТО ТАКІ СУРАГАТАР?

Першая спроба змяніць такое становішча і аддзяліць войтаўства ад ваяводства была зроблена падстоліем віцебскім Францішкам Антоніем Булгаком.

— Ён уважліва прачытаў прывілей Уладзіслава Вазы ад 28 верасня 1641 года і атрымаў уяўленне аб працэдуры выбараў войта. А яна ж была прапісана ў складзеным амаль 90 гадоў таму прывілеі, і, адпаведна, была грунтоўна прызабытай. І калі 10 чэрвеня 1728 года ваявода і войт віцебскі Казімір Аляксандр Пацей памёр, дзве пасады на некаторы час сталі вакантнымі, чым скарыстаўся Францішак Булгак, — канстатуе Максім Макараў.

Булгаку ўдалося разнастайнымі абяцанкамі прыцягнуць на свой бок вярхі мяшчанскай абшчыны, арганізаваць працэдуру выбараў сябе кандыдатам. У выніку 7 верасня 1729 года ён атрымаў прывілей ад караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста II.

Гэта выклікала абурэнне ў віцебскай шляхты, якая мела права выбіраць ваяводу і якая лічыла войтаўства неад'емнай часткай ваяводскай пасады. Да караля накіравалі паслоў.


Прывілей Уладзіслава Вазы віцебскім мяшчанам, 28 верасня 1641 года (копія ў складзе Кнігі прывілеяў Віцебска 1730-х гадоў).

— Яны прасілі яго перагледзець сваё нядаўняе рашэнне. Аўгуст II пайшоў насустрач. 17 красавіка 1730 года адмяніў дзеянне прывілея і часова перадаў войтаўскія паўнамоцтвы сурагатару гродскаму (замкаваму) — фактычна — замяшчальніку кіраўніка мясцовай улады Казіміру Саковічу. Паралельна манарх выдаў універсал аб правядзенні ў тым жа годзе свабодных выбараў ваяводы, які павінен быў стаць наступным віцебскім войтам, — удакладніў эксперт.

Францішак Булгак спрабаваў вярнуць тое, што страціў. Разам з прыхільнікамі з мяшчан ён ездзіў да караля ў Гродна. Але паўплываць на сітуацыю ўжо не змог. У канцы 1730 года ваяводам і войтам віцебскім быў зацверджаны абраннік шляхты магнат Марцыян Міхал Агінскі. 7 лютага 1731 года ён урачыста прыняў абедзве пасады з рук сурагатара.

### ПАСАДА СТАЛА ВАКАНТНАЙ

Пазней Агінскі пажадаў перадаць уладу сыну Станіславу Ежы, на той момант кашталяну мсціслаўскаму. 30 сакавіка 1739 года ён атрымаў ад караля на гэта пісьмовую згоду. Але ў выніку, добра памятаючы нядаўнюю гісторыю з Булгаком і не жадаючы разрываць войтаўства з сенатарскім крэслам ад Віцебскага ваяводства, часова устрымаўся ад ажыццяўлення плана.

У дакументах віцебскага магістрата першай паловы 1740-х гадоў мясцовым войтам заўсёды выступае менавіта Марцыян Агінскі. Да пытання аб перадачы войтаўства сыну, які ўжо стаў кашталянам віцебскім, ваявода планаваў вярнуцца на сейме 1748 года.

— Аднак 14 чэрвеня 1748 года Станіслаў Агінскі нечакана памёр у Варшаве. І па логіцы пасада кіраўніка гарадской адміністрацыі стала вакантнай, — канстатуе гісторык.

Сітуацыяй скарыстаўся палкоўнік войскаў ВКЛ Юзаф Сасноўскі. Ужо 22 чэрвеня 1748 года ад караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста III ён атрымаў прывілей на войтаўства. 3 ліпеня Сасноўскі прынёс адпаведную прысягу перад канцлерам і актамі метрыкі ВКЛ, пасля чаго фактычна стаў паўнапраўным войтам. Марцыян Агінскі быў шакаваны такім непажаданым развіццём падзей, але саступаць не збіраўся. Ён спрабаваў дамовіцца з апанентам. Але ўсе намаганні аказаліся марнымі. Усё скончылася штурмам віцебскай ратушы. Пра што мы паведамлялі раней.

***(Працяг будзе.)***

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2018 года.**